
Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!
Францішак БАГУШЭВІЧ



НАША СЛОВА

Штотыднёвая газета
(Выходзіць з сакавіка 1990 г.)

№ 44 (204)

2 лістапада 1994 г.

Кошт — 40 рублёў

ПОСТУП ТЫДНЯ



○ ***ПРАЙШЛА МАСКОЎСКАЯ СУСТРЭЧА КІРАЎНІКОЎ ДЗЯРЖАЎ СНД.*** *У парадак дня было ўключана 10 пытанняў. У час пасяджэнняў свой характар паказаў наш Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка. На прапанову Прэзідэнта Расіі назначыць кіраўніком калегіі Міждзяржаўнага эканамічнага камітэта экс-прэм'ера Вячаслава Кебіча ён адказаў, што гэта назначэнне будзе абразай і яго асабіста, і ўсяго беларускага народа. Справа закончылася тым, што кандыдатура спадара Кебіча была знята. І яшчэ. Калі лідэры дзяржаў пачалі абмяркоўваць ідэю Нурсултана Назарбаева аб Еўразійскім саюзе, Аляксандр Лукашэнка без дыпламатычных эківокаў адзначыў: «Калі тры першыя пытанні ідуць у развіццё ідэі інтэграцыі СНД, то чацвёртае (ідэя казахскага прэзідэнта) накіравана супраць Садружнасці». Нашага Прэзідэнта падтрымаў Барыс Ельцын.*

○ **У ЧАС МАСКОЎСКАЙ СУСТРЭЧЫ КІРАЎНІКОЎ ДЗЯРЖАЎ СНД** Беларусі было прапанавана абмеркаваць пытанне аб накіраванні сваіх войск для ўдзелу ў міратворчых аперацыях у Таджыкістане. Аднак Беларусь не падпісала нават базавыя дакументы аб статусе міратворчых сіл.

○ ***МІНІСТР ЗАМЕЖНЫХ СПРАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ УЛАДЗІМІР СЯНЬКО ПРА РАЗМОВЫ БЕЛАРУСКАЙ ДЭЛЕГАЦЫІ З РАСІЙСКІМІ КІРАЎНІКАМІ СКАЗАЎ:*** *«Мне прыемна, што пры вельмі добразычлівых адносінах да Расіі ідзе рашучае адстойванне нашых натуральных нацыянальных інтарэсаў. Я лічу, што гэта якраз тое, чаго нам не хапала».*

○ **У МЕНСКІМ ДЗЯРЖАЎНЫМ ЛІНГВІСТЫЧНЫМ УНІВЕРСІТЭЦЕ ПРАЙШЛА НАВУКОВА-ПРАКТЫЧНАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ** «Беларуская мова сярод еўрапейскіх». Матэрыялы канферэнцыі «Наша слова» мяркуе змясціць на сваіх старонках у бліжэйшых нумарах. Дарэчы, на канферэнцыі прагучала, што беларуская мова займае 76-е месца сярод 310 моў свету, колькасць носьбітаў якіх перавышае адзін мільён.

○ ***У СТАЛІЦЫ НАШАЙ КРАІНЫ ЎРАЧЫСТА АДЗНАЧАНА 49-Я ГАДАВІНА СТВАРЭННЯ Ў САН-ФРАНЦЫСКА АРГАНІЗАЦЫІ АБ'ЯДНАНЫХ НАЦЫЙ.***

○ **ШАНОЎНЫЯ ЧЫТАЧЫ «НАШАГА СЛОВА»!** Ідзе падпіска на перыядычныя выданні на першае паўгоддзе 1995 года. На «Наша слова» можна падпісацца ў любым паштовым аддзяленні нашай краіны. Кошт падпіскі на адзін месяц: 175 рублёў; на тры месяцы — 525 рублёў; на паўгоддзе — 1050 рублёў. Калі вы яшчэ не падпісаліся на «Наша слова», а думаеце гэта зрабіць, то паспяшайцеся — да канца падпісной кампаніі засталося толькі тры тыдні. Індэкс «Нашага слова» 63865.

Яго хацелі расстраляць пад нумарам 47.
Стар. 2—3.

Цёмныя Ляды ў жыцці Якуба КОЛАСА.
Стар. 6.

Неаднойчы даводзілася чуць пра працаздольны творчы педагагічны калектыў сярэдняй школы № 168 г.Менска. Пра ягоны высокі прафесіяналізм і адданасць справе выхавання дзяцей. І ў тым ліку пра Валянціну Віктараўну Скалаба, якая працуе ў беларускамоўным 2 В класе. Пакуль адзіным з навучаннем усіх прадметаў на беларускай мове ў гэтай паралелі. Дзеці любяць яе, а бацькі вельмі паважаюць. Яна згадзілася адказаць на пытанні нашага карэспандэнта.

БЕЗ МОВЫ НЕЛЬГА НАВУЧЫЦЬ ЛЮБІЦЬ І ПАВАЖАЦЬ РАДЗІМУ

— Скажыце, калі ласка, Валянціна Віктараўна, даўно Вы выкладаеце на беларускай мове?

— Першы год. Раней даводзілася вучыць дзяцей на рускай мове. А тут, у гэтай школе ў апошнім маім выпуску ўвялі прадметнае выкладанне. Выкладаць беларускую мову прапанавалі мне. Я з радасцю згадзілася, паколькі з дзяцінства захаплялася мовамі, асабліва беларускай. Пачала выкладаць у паралелі трэціх і чацвёртых класаў беларускую мову і літаратуру. Працавала з задавальненнем. Бачыла: дзецям вельмі падабаецца наша мова, асабліва яе вамаўленне. На ўрокі прыносіла шмат жартоўных тэкстаў, вершыкаў, лічылак. Дзеці з задавальненнем іх вучылі. Па асабістаму жаданню скончыла курсы па беларускай мове пры ІУН, таму што адчувала: гэта дапаможа ў працы. Калі прынесла даведку ў школу, адміністрацыя здзівілася: «Калі вы паспелі?» Калі ж у мінулым годзе па жаданні бацькоў стварылі беларускамоўны клас, то ўсе настаўнікі пачатковай школы загадзя ўжо ведалі: гэты клас абавязкова будзе маім. Так яно і атрымалася. Зараз працую з ім другі год.

— Значыць, дзецям беларуская мова падабаецца ці тут ёсць нейкі прымус з боку бацькоў?

— Падабаецца. Я гэта бачу па іх вочках. Калі пачынаю нешта цікавае, займальнае расказваць, вочкі ў іх гараць. Пытаюся — у класе адразу лес рук! Кожны хоча адказваць.

— А як у часе перапынкаў?

— Размаўляем з дзецьмі толькі па-беларуску — і на ўроках, і на перапынках. Цяпер многія з іх не проста перакладаюць у думках сказы з рускай мовы на беларускую, а ўмеюць думаць па-беларуску. Ім гэта падабаецца.

— А як ставяцца да беларускай мовы іх бацькі?

— Вельмі станоўча. Спачатку бацькоўскія сходы ў першым класе даводзілася весці на рускай мове, улічваючы, што большасць бацькоў або забылася на беларускую, або яе не ведаюць. Тым не менш хачу адзначыць — ні адзін бацька не аддаў сваё дзіця ў гэты клас пад прымусам. толькі па ўласным жаданні. Дарэчы, бацькі мяне падтрымліваюць ва ўсіх маіх пачынаннях, шмат дапамагаюць. Усе яны вельмі хочуць, каб іх дзеці вучыліся на беларускай мове.

— Наколькі я ведаю, у гэтым годзе да Вас перавялі па жаданні бацькоў некалькі дзяцей і з рускамоўных класаў.

— Дваіх. Гэта прыемна, і я ўпэўнена, бацькі паступілі правільна, на карысць сваім дзецям. Без мовы нельга навучыць любіць і паважаць радзіму, увогуле выхаваць добрыя грамадзянскія якасці.

— Валянціна Віктараўна, а чаму Вы сталі настаўніцай? Дзе нарадзіліся?

— Нарадзілася я на Брэстчыне, у Ляхавіцкім раёне. Мой бацька быў ваеннаслужачы, таму даводзілася шмат ездзіць па краіне. Але ўсё свядомае жыццё правяла ў Старых Дарогах, невялічкім раённым цэнтры на Меншчыне. А настаўніцай марыла стаць з дзяцінства, бо вельмі любіла дзяцей. Пасля школы паступіла ў педвучылішча. Пасля працавала настаўніцай пачатковых класаў. Пазней закончыла завочна педінстытут. Больш за 20 гадоў працую настаўніцай. Работу сваю вельмі люблю. Кажуць, цяпер у школе засталіся толькі энтузіясты. Мабыць, на самай справе гэта так. Бо за такія грошы працуюць толькі тыя, хто вельмі любіць свой прадмет і не ўяўляе сваё жыццё без навучання дзяцей.

— А як Вы рыхтуецеся да ўрокаў, да сустрэч з дзецьмі?

— Бывае, рыхтуюся не толькі я, а ўся сям'я. Калі нешта трэба клеіць, маляваць, то далучаюцца муж і дзеці. З адным падручнікам урок не правядзеш. А ў школе ёсць толькі крэйда і дошка. Перад кожным урокам пераглядаю шмат дадатковай літаратуры, каб знайсці нешта цікавае, непаўторнае, тое, чаго яшчэ раней не было. Няма ніводнага ўрока, каб я не давала дзецям той самы вершык ці тую самую лічылку, што былі на мінулым уроку. Кожны раз нешта новае. Ім падабаецца і хочацца вучыцца па-беларуску.

— Валянціна Віктараўна, у Вашым класе дзеці атрымліваюць добрыя веды. Здавалася б, такія вынікі магчымыя толькі пры строгасці. А вось Вы вельмі пяшчотна з дзецьмі размаўляеце на перапынках. Яны нават могуць, я заўважыла, узяць Вас за руку, як сяброўку. Дзе тут мяжа паміж патрабавальнасцю і такім сяброўствам з дзецьмі?

— Мяжы, мабыць, такой няма. А ўвогуле я ніколі не сваруся і не крычу на дзяцей, як гэта часта бывае. Я з імі заўсёды разважаю. Заўсёды ім тлумачу, што яны сёння зрабілі дрэннае і за што я з імі сёння не буду сябраваць. Калі я камусьці зрабіла заўвагу, то дзеці ведаюць, што я абавязкова растлумачу, што ён зрабіў не так. Я абмяркоўваю з дзецьмі іх учынкі, паводзіны, адзнакі. Калі ў мяне нейкае гора, я ім расказваю, калі нейкая радасць, то яны таксама ведаюць. Я вельмі шкадую дзяцей, таму што ім цяжка ў сям'і і ў школе. Яшчэ ў працы мне вельмі дапамагаюць жарты. Можа трэба было б дзе і насварыцца, а я пажартую. І дзіця хутчэй разумее заганнасць свайго ўчынку. А калі крычаць на яго перад класам і сварыцца — будзе адно — зацятасць ды страх, а разам і азлабленне.

— Настаўнікі пачатковых класаў падтрымліваюць сувязі паміж сабой?

— А як жа, абавязкова. Пачатковая школа ў нас моцная. Працуюць вопытныя настаўнікі, адданыя дзецям. Часта праводзяцца адкрытыя ўрокі, з якіх сапраўды можна нешта ўзяць для сябе, для працы з дзецьмі. Працуюць сістэматычна метадычныя аб'яднанні. А ўвогуле ў нас моцны педагагічны калектыў. Таму школа мае такі высокі аўтарытэт у раёне.

— Дзякуй, Валянціна Віктараўна, што знайшлі час для сустрэчы. Жадаю Вам поспехаў у Вашай нялёгкай, але такой патрэбнай усім справе — выхаванні нашых дзетак.

Распытвала
Любоў БАРШЧЭЎСКАЯ.

ЖЫЦЦЁ ТАВАРЫСТВА

ДА ВЕДАМА СЯБРОЎ РЭСПУБЛІКАНСКАЙ РАДЫ ТБМ ІМЯ ФРАНЦІШКА СКАРЫНЫ

18 лістапада г.г. у Доме літаратара (канферэнц-зала, другі паверх) адбудзецца пасяджэнне Рэспубліканскай Рады.

На абмеркаванне выносяцца пытанні:

1. «ТБМ імя Францішка Скарыны і дзяржаўная моўная палітыка».
2. «Аб задачах ТБМ у перыяд падрыхтоўкі да выбараў у Вярхоўны Савет і органы мясцовага самакіравання».

Пачатак а 14-й гадзіне.

Паведаміце, калі ласка, аб магчымасці Вашага ўдзелу ў пасяджэнні Рады па адрасу: Румянцава, 13, тэл. 332511, 331352.

Іншагародніх просім паведаміць, ці патрэбна гасцініца.

Сакратарыят ТБМ імя Францішка Скарыны.

ЖЫЦЦЁ ТАВАРЫСТВА

ПАСТАНОВА

ўстаноўчай канферэнцыі па стварэнні абласной арганізацыі ТБМ (Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны)

Падтрымліваючы ініцыятыву Гомельскай гарадской Рады ТБМ і абласнога ўпраўлення адукацыі па стварэнні абласной арганізацыі Таварыства беларускай мовы, устаноўчая канферэнцыя

пастанаўляе:

1. Абвясціць стварэнне абласной арганізацыі Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны, якая кіруецца ў сваёй дзейнасці Статутам Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны і першаступеннай задачай мае адраджэнне ў духоўным жыцці народа беларускай мовы і праз яе ўсёй нацыянальнай культуры.
2. Прасіць аблвыканкам і Рэспубліканскую Раду ТБМ зарэгістраваць абласную арганізацыю ТБМ і аказваць ёй падтрымку ў дзейнасці, вызначанай Статутам.
3. Абласная канферэнцыя вітае ўсякі грамадскі рух, які спрыяе адраджэнню беларускай культуры, мовы, дзяржаўнасці Рэспублікі Беларусь, і выказвае спадзяванне, што кіраўніцтва органаў улады вобласці, усе грамадскія арганізацыі і сродкі масавай інфармацыі будуць рабіць усё магчымае для падтрымкі гэтага працэсу.
4. Абласная ўстаноўчая канферэнцыя заклікае ўсіх грамадзян, якія пражываюць у вобласці, актыўна падтрымаць дзейнасць Таварыства.
5. Канферэнцыя ўхваляе падрыхтаваны аргкамітэтам тэкст Звароту да Прэзідэнта.

Устаноўчы сход сяброў Таварыства беларускай мовы,
кастрычнік, 12-га, 1994 год, Гомель.

ЗВАРОТ

да Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад удзельнікаў Гомельскай абласной канферэнцыі Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны

Паважаны спадар Прэзідэнт!

Да Вас звяртаюцца ўдзельнікі Гомельскай абласной канферэнцыі Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны.

Мы, як і ўсе сумленныя грамадзяне Рэспублікі Беларусь, заклапочаны лёсам нашай роднай мовы. Яна, і толькі яна ёсць і будзе адзінай дзяржаўнай мовай нашай незалежнай Беларусі.

Мы патрабуем:

1. Строга кантраляваць выкананне Закона аб мовах у дзяржаўных установах, для чаго лічым патрэбным стварыць спецыяльную камісію.
2. Спыніць шальмаванне дзяржаўнай мовы і дзяржаўных сімвалаў Рэспублікі Беларусь, зацверджаных Канстытуцыяй.
3. Забараніць дзейнасць палітычных партый і арганізацый, накіраваных супраць дзяржаўнага суверэнітэту нашай Бацькаўшчыны.

Зычым Вам плёну ў абудове нашай дзяржаўнасці, што ёсць адзіным гарантам годнага жыцця ўсіх народаў Беларусі.


Прынята аднагалосна.

12 кастрычніка 1994 г.
г. Гомель.

РУПЛІЎЦЫ

Уладзімір Паўлавіч Кармілкін — чалавек адметнага лёсу: вырас у сям'і патомных камуністаў, шмат гадоў праслужыў ва Узброеных Сілах СССР, а калі выйшаў на пенсію — нечакана для сябе і для іншых — стаў удзельнікам нефармальнага руху. Быў фатографам-аматарам. Паступова вырас у майстра. Яго работы, насычаныя эмоцыямі і глыбокім сэнсам, нацэленыя на перадачу драматычных і гераічных момантаў з жыцця сучаснікаў, ахвотна публікуюць беларускамоўныя выданні («Чарнобыльскі шлях» (1989), «Сябры Беларускага згуртавання вайскоўцаў прысягаюць на вернасць Беларусі» (1992), «Дзяды ў Курапатах» (1993), «Войска супраць дзяцей і старых» (1994), «Дэлегаты III з'езда БНФ» (1993), «Зянон Пазьняк і Васіль Быкаў» (1993), «Алесь Адамовіч» (1993), «Мікола Ткачоў» (1993) і іншыя).

Уладзімір Паўлавіч лічыцца чалавекам Народнага фронту, але гэта не зусім так. Дэмакрат і патрыёт, ён заадно з усімі, хто змагаецца за годнае жыццё беларускага народа. І яшчэ Кармілкіна не-не ды і назавуць летапісцам беларускага Адраджэння, паколькі ён запісвае на магнітную стужку выступленні дзеячаў, якіх час выводзіць у духоўныя лідэры нацыі, а таксама фатаграфуе мерапрыемствы БНФ, робіць фотаальбомы, фотастэнды і фотавыставы па свежых слядах падзей і з нагоды юбілеяў і святочных дат. Магчыма, перабольшання тут і няма, але да Уладзіміра Паўлавіча больш стасуецца іншае азначэнне — «чорнарабочы Адраджэння». Паколькі ён выконвае і ўсялякую іншую работу па забеспячэнні дзейнасці БНФ. Карацей, робіць усё, што можа, і ўсё, што ўмее, дзеля справы, якой служыць.



ЯГО ХАЦЕЛІ РАССТРАЛЯЦЬ ПАД НУМАРАМ 47

— Уладзімір Паўлавіч, сёння ўсё больш і больш людзей становяцца прыхільнікамі адраджэння беларускай мовы, культуры і дзяржавы. А як Вы, рускі па нацыянальнасці і прафесійны вайсковец, набылі статус беларускага адраджэнца? Што на Вас паўплывала?

— Сапраўды, я запісаны рускім. Я нарадзіўся ў Смаленску, але доўга не ведаў, што мой родны горад быў горадам беларускім. Нам казалі, што ніякія мы не беларусы, а чыстакроўныя русакі. З гэтым я і пайшоў у жыццё. Жыву ў Менску з 1945 года, куды бацьку-афіцэра перавялі служыць у штаб арміі. Мы жылі ў верхнім горадзе на Таргова вуліцы, дзе захаваліся старыя драўляныя будынкі. Што мяне тады найбольш уразіла, дык гэта чысцюткая, крынічная вада Свіслачы, у якой плавалі рыбкі. З ракі мы пілі ваду, купаліся ў ёй. Як пачаў ездзіць за горад на веласіпедзе, каб палюбавацца прыродай, тады і пачаў знаёміцца з карэннымі беларусамі. Дадам, што выхоўваўся ў сям'і ярых камуністаў і сталіністаў. Камуністамі былі мае дзед, дзядзька і бацька. Памятаю, маці вышывала партрэт Леніна, а я ездзіў на матацыкле з партрэтам Сталіна на ветравым шкле.

— А як адносіліся да беларусаў у афіцэрскім асяроддзі?

— Скажу пра школу і сваіх аднагодкаў — дзяцей ваеннаслужачых. У нашых табелях было напісана: «Вызваляецца ад вывучэння беларускай мовы». І гэта, ведаеце, накладвала адпаведны адбітак на адносіны дзяцей афіцэраў да беларускай культуры і беларусаў-школьнікаў. Урокі беларускай мовы мы прагульвалі на двары. Аб самой мове ішла гаворка, што яна брыдкая, грубая, — не паразнаць з украінскай, не тое, што з расійскай. Беларусаў абзывалі бульбашамі, насміхаліся над іх вымаўленнем. Школа не давала магчымасці такім, як я, вывучаць беларускую мову, сеяла ў душах дзяцей зерні вялікадзяржаўнага шавінізму. Цяпер я разумею, чаму такое адбывалася: каб паказаць, што беларусы — гэта адно, а рускія — зусім іншае. Я рос і наіўна думаў, што на галаву вышэй за кожнага беларускага хлопчыка. Калі служыў у арміі — бачыў тое самае — раз'яднанне людзей па нацыянальнай прыкмеце. Асабліва даставалася літоўцам і эстонцам. Іх больш пасылалі ў нарад, больш выкарыстоўвалі на чорных работах, насміхаліся над імі. Я назіраў здзеклівыя адносіны да іх з боку афіцэрскага корпуса, старшын і прапаршчыкаў. Вось, прыкладам, чалавек працуе на кухні. Яго аклікаюць не па імені, не па прозвішчу, а проста так: «Эй ты, немец (або «Эй ты, фашыст»), ідзі сюды!»

— І ён ішоў?

— Ён падымаўся і паціху ішоў. Эстонцы, між іншым, ніколі не спрачаліся, не ўдзельнічалі ў бойках, былі ўраўнаважаныя і старанныя. З арміі я вынес перакананне аб той несправядлівасці, якая чынілася ў адносінах да людзей іншых нацыянальнасцей. У арміі ніколі не было адзінства і няма яго дагэтуль. Што да мяне, то я добра адносіўся як да прыбалтаў, так і да беларусаў, якія, дарэчы, не гуртаваліся разам, як, прыкладам, тыя ж грузіны або прыбалты. Я спрабаваў вывучаць эстонскую мову і ведаў на той час, што беларусы маюць вялікіх пісьменнікаў — Коласа, Купалу, Багдановіча.

— Вернемся да галоўнай тэмы: калі Вы сталі духоўным дысідэнтам?

— Канчаткова я ім стаў у арміі. А да гэтага на мае перакананні паўплывала так званая справа крамлёўскіх урачоў. Інтуіцыя мне падказала, што гэта справа «шыта белымі ніткамі». Тады я ўпершыню адчуў ушчэрбнасць рэжыму і напісаў з дзесятак улётак (раскідаў іх па праспекту Сталіна), у якіх было сказана: «Далоў тыранаў!» і яшчэ штосьці пра свабоду. Пад тыранамі я меў на ўвазе Сталіна, Берыю, Малянкова і іх паплечнікаў.

— Вы зрабілі гэта патаемна ад бацькоў?

— Вядома ж. Хіба бацька, які раз за разам выбіраўся сакратаром партарганізацыі і меў шмат узнагарод па партыйнай лініі, мяне б зразумеў?

— А далей было што?

— Яшчэ да арміі, у 1954 г., я працаваў на заводзе імя Леніна, дзе ўпершыню адчуў той непамерны ідэалагічны прэс, пад якім жыло грамадства. Яго стваралі сваёй дзейнасцю палітычныя гурткі, арганізацыі, сродкі масавай інфармацыі. А я не цярплю, каб на мяне ціснулі зверху.

— І тым не менш Вы праслужылі ў такой жорсткай структуры, як армія, шмат гадоў?

— Служыць з маім характарам было цяжка. Я не мог лавіраваць і хітрыць, да салдат адносіўся з дабратой, а камандзірам гаварыў праўду ў вочы, за што мяне і не любілі. Першы раз быў пакараны за фармальныя адносіны да палітзаняткаў і няправільнае вядзенне канспектаў. Прыгразілі звольніць з арміі і аддаць пад суд. У выніку атрымаў вымову. А ўсяго за службу ў арміі я атрымаў дваццаць тры спагнанні, хоць, праўда, зрэдку перападалі і ўзнагароды.

— У партыю не ўступалі?

— Не ўступаў, бо не хацеў рабіць так, як усе, хоць у арміі беспартыйных за людзей не лічылі.

— І вось Вы пайшлі на пенсію...

— Армейская несправядлівасць сфарміравала мяне дысідэнтам, таму раней ці пазней я павінен быў сустрэцца з Зянонам Пазьняком. Аднойчы пачуў ад вайскоўцаў, едучы ў аўтобусе, што так званыя нефармалы, на падабенства рагатых дзікуноў, маюць ладзіць на Маскоўскіх могілках свой шабаш — Дзяды. Кастрычніцкай раніцай я паехаў на могілкі. А там ужо міліцыі што бобу. Да мяне падышлі, калі стаяў ля магілы маці. Пачалі распытваць, чаго я тут і ці не з тымі вунь людзьмі прыйшоў, што за брамай. Мяне гэта абурыла і здзівіла. Перад могілкамі я ўбачыў чараду людзей, сярод якіх былі старыя і дзеці з букетамі ў руках. Гэта былі звычайныя, прыстойныя, сімпатычныя людзі. На могілкі іх не пусцілі, і яны пасталі на калені памаліцца перад агароджай. Быў мітынг. Было супрацьстаянне народа і ўнутраных войскаў. Было збіванне людзей, калі ў ход пайшлі газавыя балончыкі і дубінкі, а жанчын за валасы цягалі ў аўтобусы. Натоўп падаўся ў поле, а за ім, як ваўкі, ланцугом пайшлі спецназаўцы. Быў мітынг у полі, калі ўпершыню над галовамі людзей узвіўся нацыянальны беларускі сцяг. У душы маёй адбыўся пералом. Я адчуў сябе на баку

народа. Разам з усімі пайшоў у Курапаты, дзе пазнаёміўся з Пазьняком, Марачкіным, Арловым, супрацоўнікам «Звязды» Траяноўскім. З таго часу стаў сапраўдным пазьнякоўцам, стаў франтаўцам. Я зразумеў, што такое камунізм і камуністы і як яны могуць дзейнічаць.

На Дзяды я прыйшоў з фотаапаратам і шмат здымаў. З кароткай стрыжкай і ў добрым паліто я нагадваў пераапранутага КДБіста, мяне не чапала міліцыя. Мае здымкі прыдаліся, калі Пазьняка спрабавалі судзіць за арганізацыю гэтай акцыі. Я хадзіў да пракурора і сведчыў супраць паліцэйскага самавольства ўлад, што начальству, ведама, не спадабалася. Затым я пачаў наведваць усе франтаўскія імпрэзы, якія праходзілі ў Доме мастацтва, у Доме літаратара, у музеі М.Багдановіча, у майстэрнях на праспекце Машэрава і ў іншых месцах. Так пачалося маё супрацоўніцтва з БНФ.

— Ці атрымліваеце Вы заданні ад Народнага фронту?

— Ніколі. Да гэтага часу працую ўвім самастойна. І ў арміі такім быў. А раблю ўсё, што трэба. Трэба вянок зрабіць? Калі ласка. Адрамантаваць радыётэхніку? Калі ласка. Запісаць мітынг? Зноў жа гатоў. Кіруюся пачуццём маральнага абавязку. Свае стэнды, фотагазеты выстаўляю ў памяшканнях, на вуліцах і ў месцах правядзення масавых акцый. Абыходжуся ўласнымі сіламі і грашыма. Адзінае, што мяне ахоўваюць ад нападак якіх-небудзь чыкінцаў або хуліганаў, каб яны не знішчылі выставу. Мае фота з'яўляюцца ў «Народнай газеце», «Беларускай энцыклапедыі», «Нашым слове», часопісах «Беларуская мінуўшчына», «Мастацтва», «Полацак». Іх можна ўбачыць у Зборы твораў В.Быкава, у кнізе М.Ткачова «Паходня», у кнізе З.Пазьняка «Сапраўднае аблічча» і іншых выданнях.

— Ці сталі Вы сябрам БНФ?

— Фармальна не ўступіў у Фронт. І гэта ў кагосьці ляжыць на сумленні. Сёлета мне споўнілася шэсцьдзесят гадоў. І я папрасіў, каб на юбілей мне ўручылі пасведчанне франтаўца пад нумарам 47. Ды чамусьці не атрымаў яго. Не буду на гэтым настойваць. У душы і на справе я — франтавец.

— А чаму за нумарам 47?

— Калі быў яшчэ жывы мой бацька, ён дзесьці даведаўся, што ўсе актывісты БНФ і прыхільнікі Адраджэння трапілі ў чорныя спісы. У выпадку перамогі ГКЧП гэтых людзей чакала расправа. Пазьняк у спісе ішоў першым. Я — сорак сёмым.



Васіль Быкаў і Рыгор Барадулін. Менскі парк Янкі Купалы, 19 чэрвеня 1994 г.

Бацька быў на мяне злосны і аднойчы сказаў: «Вось ты дабегаешся, дастукаешся са сваім Фронтам. Цябе расстраляюць пад нумарам 47».

— Якія ў Вас адносіны з лідэрам БНФ?

— Ён карыстаецца маёй дапамогай, але ставіцца да мяне



Алесь Адамовіч і Зянон Пазьняк. Акцыя «Чарнобыльскі шлях», 1990 г.

суха і насцярожана. І не толькі да аднаго мяне. Хацелася б часцей бачыць яго прыветны погляд і ўсмешку на твары. Няхай ён будзе ўпартым, непахісным і нязломным у дасягненні сваёй мэты, але няхай ён стане больш мяккім і ўважлівым да людзей. У маім уяўленні Пазьняк — сімвал Беларусі і беларускасці. Ён першы расказаў пра трагедыю Курапатаў, першы ўзняўся супраць сённяшніх чырвона-карычневых. А колькі правеў масавых акцый, мітынгаў, мерапрыемстваў, пачынаючы ад Дзядоў і Чарнобыльскага шляху! Колькі добрага, важнага, патрэбнага для Бацькаўшчыны ён зрабіў! Але Пазьняку не хапае памочнікаў, перашкаджае слабая тэхнічная база БНФ. За ўсё Зянон Станіслававіч бярэцца сам, таму яму цяжка маральна і фізічна.

— Ваша стаўленне да гістарычнай беларускай сімволікі?

— Прызнаю яе адзінай і незаменнай. Калі мы яшчэ жылі ў Саюзе, я пашыў бел-чырвона-белы сцяг і паехаў з ім на пахаванне акадэміка Сахарава. Са мной паехалі яшчэ тры чалавекі. Наша інтэрнацыянальная група — два беларусы, рускі і яўрэй — ішла за труной Сахарава, прыспусціўшы долу сцяг з жалобнай стужкаю. На нас напалі васільеўцы з «Памяці» — хацелі адабраць сцяг, а абаранілі нас зеленаградцы, якія вылучалі Сахарава ў народныя дэпутаты. Хачу падкрэсліць: хоць нас ніхто не ўпаўнаважваў, але прыехалі мы туды ад імя БНФ. У агенцтве «Навіны» да партрэта акадэміка мы паклалі кветкі і паставілі свечку з надпісам: «БНФ — Сахараву».

— Дзе цяпер Ваш сцяг?

— У Санкт-Пецярбургу, у музеі рэвалюцыі. Яго забраў у нас супрацоўнік гэтага музея спадар Трубкін.

— Ці задавальняе Вас грамадскі характар Вашай дзейнасці, тое, што Вы робіце? У гэтым аспекце прыгадаю Ваш артыкул у «Народнай газеце» ў абарону беларускай мовы («Давайце не будем класть ноги на стол соседа») і судовую справу з чыкінскай газетай «Мы и время», якую Вы выйгралі.

— Мала сказаць, што задавальняе. У гэтым увесь сэнс майго жыцця. Вось закрылі, напрыклад, радыёстанцыю «Крыніца», перасталі выходзіць радыёперадачы і «Беларускай маладзёжнай» — з'явілася газета пад такой назвай. Як пенсіянер, як рускі я імкнуся падтрымаць выданне і яго калектыў. Купляю газету, званю ў рэдакцыю, каб сказаць людзям добрае слова. Быў на юбілеі «Маладзёжнай».

Перажываю і за «Свабоду». Удзельнічаў у акцыях пратэсту, калі гэту газету спрабавалі закрыць — стаяў перад Домам друку ў пікеце.

Як вядома, БНФ падтрымліваў рух Народных франтоў Прыбалтыкі, што вялі барацьбу за свабоду і суверэнітэт сваіх краін, якія паспрабавалі аддзяліцца ад СССР. У пакаранне Масква аб'явіла Літве эканамічную блакаду і пачала наладжваць там палітычныя правакацыі. Я з франтаўцамі, у групе з трынаццаці—пятнаццаці чалавек, пачаў туды ездзіць. Мы аказвалі маральную падтрымку Саюдзісу, сустракаліся з Ландсбергісам, распаўсюджвалі ў Вільні свае франтаўскія выданні, арганізоўвалі фотавыставы на тэму: «Рукі прэч ад Літвы!». А калі пралілася нявінная кроў у ноч з 12 на 13 студзеня 1991 г., мы выехалі ў Вільню і нейкі час пражылі з яго абаронцамі на барыкадах, ля вогнішча перад парламентам, каля тэлецэнтра. Да нас далучыліся людзі з Ленінграда, з Украіны. У сутычках з амонам нам не давялося ўдзельнічаць, але мы былі да гэтага гатовы. Мы прымалі ўдзел у пахаванні ахвяр той страшнай ночы, на якое прыбыло шмат людзей з Беларусі. Я прывёз адтуль шмат здымкаў.

— Якая з дэмакратычных беларускіх арганізацый Вам найбольш блізкая?

— Беларускае згуртаванне вайскоўцаў. Я не толькі фатаграфаваў акцыю прысягі БЗВ на вернасць Беларусі, але і сам прысягаў разам з імі — у форме прапаршчыка-авіятара. Я гарачы прыхільнік гэтага Згуртавання таму, што яго людзі — патрыёты Беларусі, спрабавалі праводзіць у войску патрыятычнае выхаванне на прыкладах з айчыннай гісторыі і з жыцця гераічных продкаў. Гэта была спроба кансалідаваць беларусаў у войску на аснове нацыянальнай ідэі, што безумоўна паспрыяла б і выкараненню такой страшнай з'явы, як дзедаўшчына.

— Паколькі Вы родам са Смаленска, то ці не прыходзіла Вам у галаву думка, што Вы, магчыма, не рускі, а беларус?

— Калі ў апошні раз адбываўся перапіс насельніцтва і ў мяне спыталі, хто я па нацыянальнасці, дык я адказаў: «Я рускі беларус». І паўтарыў гэта перапісчыкам некалькі разоў. Мяне так і запісалі.

Распытвала Ірына КРЭНЬ.
Фота Уладзіміра КАРМІЛКІНА.



Міхась Ткачоў (злева). Плошча Перамогі, 9 мая 1991 г.

ГІСТОРЫЯ АЙЧЫНЫ — ВАЙСКОЎЦАМ

А.М.Літвін, Я.С.Паўлаў

БЕЛАРУСЫ: НАЦЫЯНАЛЬНЫЯ І ТЭРЫТАРЫЯЛЬНЫЯ ВАЙСКОВЫЯ ФАРМІРАВАННІ

(1917 — 1941 гг.)

(Працяг. Пачатак у № 42.)

Працэс стварэння часцей Чырвонай Арміі на Беларусі пачаўся пасля заняцця Менска немцамі. Як адзначаецца ў справаздачы Аблвыканкамзаха, да красавіка 1918 г. у Заходняй вобласці ў Чырвоную Армію запісалася каля 10 тыс. чалавек. Да канца 1918 г. у Віцебскай і Магілёўскай абласцях добраахвотнікамі ў Чырвоную Армію запісалася больш як 30 тыс. рабочых і сялян. Былі сфарміраваны 1, 2, 3, 4 і 5-ы чырвонаармейскія палкі імя Віцебскага савета, Сенненскі народны полк, 1-ы Мсціслаўскі народны батальён, 1-ы Рэвалюцыйны полк Аршанскага Савета. Атрады Чырвонай Арміі былі створаны таксама ў Быхаўскім, Чавускім, Чэрыкаўскім і іншых паветах. Летам 1918 г. савецкі ўрад перайшоў ад добраахвотнага прынцыпу фарміравання Чырвонай Арміі да прызыўной сістэмы, да абавязковай ваеннай службы працоўных у арміі. З верасня 1918 г. да канца года з Беларусі было прызвана ў Чырвоную Армію каля 100 тысяч рабочых і працоўных сялян, на месцах наладжвалася ваеннае навучанне працоўных. З Беларусі на Усходні фронту 1918 г. былі накіраваны 1-ы рэвалюцыйны полк імя Менскага Савета, 2, 3-ці палкі імя Віцебскага Савета, падраздзяленні Магілёўскай дывізіі, а таксама ўкамплектаваныя на Беларусі штабы 1-й Смаленскай і 1-й Арлоўскай дывізій. Апрача гэтага, на Усходні фронт былі накіраваны асобны інжынерны батальён імя Віцебскага Савета і перасоўны шпіталь 1-й Смаленскай дывізіі.

Як вядома, у 1919 г. бальшавіцкая ўлада на Беларусі мяняла сваё аблічча некалькі разоў. Спачатку была абвешчана Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка Беларусь — ССРБ. Затым яе злілі з Літвой і абвясцілі аб утварэнні Літоўска-Беларускай ССР (Літбел), потым зноў абвясцілі аб утварэнні ССРБ. На войсках гэта адбівалася вельмі балюча. Таму ў маі 1919 г. ЦК РКП(б) прымае дырэктыву аб ваенным адзінстве. У адпаведнасці з гэтым дакументам вайсковыя часці, якія знаходзіліся на тэрыторыі Беларуска-Літоўскай ССР, былі аб'яднаны ў 16-ю армію, якая падпарадкоўвалася Рэўваенсавету. Замест ваенных аддзелаў пры выканкамах Саветаў паўсюдна сталі стварацца ваенныя камісарыяты. Пасля заканчэння грамадзянскай вайны было праведзена значнае скарачэнне узброеных сіл, к 1 лютага 1923 г. іх колькасць даведзена да 600 тыс. чалавек.

Чырвоная Армія пераводзілася на тэрытарыяльна-міліцыйныя ўмовы існавання, што прадугледжвала раўнамернае размяшчэнне часцей па ўсёй краіне, а не паблізу найбольш верагодных пунктаў нападу праціўніка, як было раней.

Пераход да тэрытарыяльнай сістэмы арміі быў вымушанай мерай, выкліканай эканамічнымі цяжкасцямі краіны, неабходнасцю скарачэння затрат дзяржавы на ўтрыманне арміі.

На тэрыторыі Заходняй ваеннай акругі, якая ў асноўным размяшчалася ў Беларусі, першым тэрытарыяльным фарміраваннем стала 2-я Беларуская дывізія, створаная ў 1923 г. на падставе 2-й Тульскай стралковай дывізіі. Яе палкі і асобныя падраздзяленні дыслацыраваліся ў Барысаўскім, Ігуменскім (Чэрвеньскім), Слуцкім і Менскім раёнах. Штаб дывізіі размяшчаўся ў Менску. 10 верасня 1923 г. пачаўся першы вучэбны збор пераменнага складу гэтага фарміравання. Праз два тыдні прызыўнікі прынялі вайсковую прысягу. Пасля гэтага камандуючы Заходняй акругай А.І.Корк уручыў дывізіі Чырвоны сцяг. Фактычна гэты акт паклаў адлік гісторыі будавання беларускіх тэрытарыяльна-міліцыйных часцей у складзе адзінай Чырвонай Арміі. У інтарэсах падрыхтоўкі нацыянальных кадраў у Заходняй акрузе была створана Беларуская аб'яднаная вайсковая школа імя ЦВК БССР. Нягледзячы на складаныя ўмовы (адсутнасць неабходных навучальных дапаможнікаў, кадраў, якія добра валодалі нацыянальнай мовай, выпрацаванай тэрміналогіі, нізкі агульнаадукацыйны ўзровень курсантаў і г.д.), новы навучальны цэнтр змог наладзіць работу і ва ўстаноўлены тэрмін падрыхтаваць неабходную колькасць нацыянальных камандзіраў. З аб'яднанай Беларускай школы выйшлі такія, стаўшыя потым добра вядомымі военачальнікамі, як У.Ф.Маргелаў, У.А.Пянькоўскі, І.І.Якубоўскі і іншыя.

У наступныя гады работа па пераводу войск Заходняй акругі на тэрытарыяльна-міліцыйны прынцып камплектавання працягвалася. На новы вайсковы стан перайшоў 16-ы стралковы корпус (Магілёў), 29-я Вяцкая стралковая дывізія (2 палкі яе размяшчаліся ў Беларусі, а астатнія часці — на Смаленшчыне), 27-я Омская стралковая дывізія (дыслацыравалася ў Віцебску і Оршы), 33-я Самарская стралковая дывізія (на Магілёўшчыне). У пачатку 30-х гадоў яна стала нацыянальнай дывізіяй, паколькі ў яе складзе беларусы перабольшвалі 80 працэнтаў, а таксама 37-я (два палкі якой размяшчаліся на тэрыторыі Беларусі). Такім чынам, з 28 злучэнняў (17 стралковых, 5 кавалерыйскіх, 1 дэсантнае), якія меліся на тэрыторыі Заходняй (з кастрычніка 1926 г. — Беларускай) ваеннай акругі, толькі 5 сталі тэрытарыяльна-міліцыйнымі.

Трэба адзначыць, што да канца 20-х гадоў цэнтральныя ўлады (партыйныя, савецкія і ваенныя) станоўча адносіліся да працэсу фарміравання тэрытарыяльна-міліцыйных часцей.

Характэрнай рысай гэтага працэсу ў Заходняй ваеннай акрузе з'ўлялася тое, што ў новых вайсковых структурах даволі сур'ёзна праводзілася палітыка беларусізацыі. У першую чаргу яна, безумоўна, закранула тыя часці і падраздзяленні, якія ў большасці сваёй былі ўкамплектаваны з ліку карэннага мясцовага насельніцтва. Такія фарміраванні фактычна станавіліся нацыянальнымі. Першым нацыянальным фарміраваннем у Заходняй ваеннай акрузе, як зазначалася вышэй, стала 2-я Беларуская стралковая дывізія, дзе колькасць беларусаў дасягала 60 працэнтаў. Беларускім стаў і 16-ы стралковы корпус. У трох палках 33-й стралковай дывізіі (97, 98 і 99-м) 40 працэнтаў старшых і сярэдніх камандзіраў паходзілі з Беларусі, а сярод малодшых камандзіраў гэты працэнт перавышаў лічбу 90.

У інтарэсах паспяховай падрыхтоўкі нацыянальных вайсковых кадраў друкаваліся беларускія лемантары, падручнікі, слоўнікі-дапаможнікі, статуты. Існаваў спецыяльны вайсковы сектар Дзяржвыдавецтва Беларусі. Да 1935 г. (пачатак згортвання тэрытарыяльных часцей і злучэнняў) ён надрукаваў 418 найменняў кніг і брашур, а па-руску — толькі 8. У акруговай газеце «Чырвонаармейская праўда» змяшчаўся асобны «куток беларуса». Спецыяльная рубрыка прысвячалася непасрэдна пытанню беларусізацыі ў вайсковых часцях. У штабе акругі існавала спецыяльная камісія па перакладу на беларускую мову вайсковых статутаў і распрацоўцы беларускай ваеннай тэрміналогіі.

У 1927 г. быў выдадзены «Практычны беларускі вайсковы слоўнік». Пры яго ўкладанні былі выкарыстаны апрацаваныя Вайсковай Камісіяй Інбелкульту лексічныя матэрыялы, ужо выдадзеныя выпускі Беларускай Навуковай Тэрміналогіі. Слоўнік налічваў каля дзесяці тысяч слоў і ўстойлівых словазлучэнняў трох функцыянальных груп.

У дапамогу камандзірам-небеларусам арганізоўваліся спецыяльныя падрыхтоўчыя курсы. Значную дапамогу ў справе беларусізацыі войска аказвалі навукоўцы і супрацоўнікі Інбелкульту, Беларускай Акадэміі навук, Наркамата адукацыі БССР і іншыя ўстановы рэспублікі. Агульнымі намаганнямі камандавання, саміх вайскоўцаў, а таксама шырокага кола дзяржаўных і грамадскіх установаў БССР да канца 20-х гадоў была закончана беларусізацыя 2-й Беларускай, 33-й Самарскай стралковых дывізій, а таксама Аб'яднанай Беларускай школы. Гэты працэс працягваўся і ў іншых часцях, што станоўча адбівалася на ўзроўні баявой падрыхтоўкі войск.

Трэба адзначыць, што аднachасова з палітыкай стварэння нацыянальных вайсковых фарміраванняў у войску пашыралася інтэрнацыянальнае выхаванне вайскоўцаў у яскрава акрэсленым накірунку «пралетарскага інтэрнацыяналізму».

Практычная дзейнасць тэрытарыяльных вайсковых фарміраванняў, ажыццяўленне ваеннай рэформы 20-х гадоў паказала, што пры пэўнай колькасці кадравых вайсковых часцей, выкарыстоўваючы тэрытарыяльна-міліцыйны прынцып камплектавання, ствараючы нацыянальныя фарміраванні, магчыма было ахапіць ваенным навучаннем шырокія масы насельніцтва, належным чынам падрыхтаваць іх да абароны. Разам з тым, далейшая цэнтралізацыя кіраўніцтва, стварэнне унітарнай таталітарнай дзяржавы, пагаршэнне міжнароднага становішча і павелічэнне ваеннай пагрозы патрабавалі і адпаведнай адзінай арміі.

З восені 1929 г. у Беларусі пачалося інтэнсіўнае стварэнне негатыўнага вобраза «нацдэмаўшчыны», якое ахапіла ўсе сферы і азначала адмову ад палітыкі беларусізацыі. Разгортванне бескампраміснай барацьбы з нацдэмамі і іншымі «ворагамі народа» фактычна сведчыла аб рэалізацыі прынцыпу іншай нацыянальнай палітыкі ў Беларусі — палітыкі антыбеларусізацыі. Што да лёсу тэрытарыяльна-нацыянальных вайсковых фарміраванняў, то ён таксама вырашаўся ў агульным рэчышчы антынацыянальнага псіхозу. У сярэдзіне — другой палове 30-х гадоў дзесяткі і сотні ваенных кадраў Беларускай акругі былі беспадстаўна рэпрэсіраваны. Многія з іх загінулі ў сталінскіх ГУЛАГах. А тыя, хто ўцалеў, вымушаны былі падпарадкавацца новым запатрабаванням у ваеннай палітыцы: у 1935—1938 гг. Чырвоная Армія стала пераводзіцца выключна на кадравы прынцып арганізацыі і камплектавання. Гэты прынцып быў канчаткова замацаваны Пастановай ЦК ВКП(б) ад 7 сакавіка 1938г. і Загадам Наркома абароны СССР К.Варашылава ад 16 сакавіка таго ж года, згодна з якімі тэрытарыяльна-нацыянальныя часці і злучэнні рэарганізоўваліся ў агульнасаюзныя, кадравыя. Такая сістэма праіснавала да распаду СССР і абвяшчэння былымі савецкімі рэспублікамі дзяржаўнага суверэнітэту.

У гады апошняй вайны выразна акрэслілася існаванне ў беларускім грамадстве дзвюх плыняў — камуністычнай і нацыянальнай. Некаторая частка людзей займала чакальную пазіцыю, імкнулася захаваць сваё жыццё, жыццё сваёй сям'і, асабістую маёмасць. Дамінуючай і найбольш актыўнай з'ўлялася першая плынь. Яна мела на сваім баку моцныя традыцыі, арганізацыйныя структуры, падтрымку большасці свайго народа, дзяржавы, рэгулярнай арміі.

Беларускі нацыянальны рух на першым этапе вайны не ўяўляў значнай сілы. Робячы стаўку на падтрымку акупантаў, ён, зразумела, не мог разлічваць на сімпатыі шырокіх народных мас. Пад канец вайны па розныя бакі барыкад аказалася значная колькасць людзей, якія фанатычна верылі ў свае ідэалы.

У сакавіку 1944 г. пасля цяжкіх паражэнняў немцаў на ўсходнім фронце акупацыйныя ўлады далі згоду Беларускай Цэнтральнай Радзе (БЦР) на фарміраванне аддзелаў Беларускай Краёвай Абароны (БКА). Некалькі падраздзяленняў БКА былі ўтвораны з фарміраванняў беларускай самааховы. У ліпені 1944 г. частка гэтых фарміраванняў адступіла разам з гітлераўцамі. Спачатку яны былі дыслацыраваны ў Аўстрыі, а потым перакінуты на тэрыторыю Германіі. Нямецкае камандаванне намагалася выкарыстаць іх на Заходнім фронце. Але дарэмна: большая частка беларускіх жаўнераў перайшла на бок 8-й брытанскай і 3-й амерыканскай армій. Прычым многія жаўнеры БКА за мужнасць у змаганні з гітлераўцамі былі ўшанаваны амерыканскімі, англійскімі і італьянскімі ўзнагародамі.

Матэрыял скарочаны;
тэкст да друку падрыхтаваў
Мар'ян ВІЖ.

ЗГАДКІ

З ЛЕТАПІСУ ХРАМА...

У перыяд сталіншчыны ворагі беларушчыны выношвалі злачынныя планы знішчэння помнікаў нашай нацыянальнай культуры, у тым ліку і Чырвонага касцёла, размешчанага на самым вялікім пляцы Менска. Помніцца, што ў свой час сталічны гарвыканкам праводзіў выставу, дзе экспанаваўся макет запраектаванай «рэканструкцыі» гэтага пляца. На месцы касцёла там ужо «красаваўся» нейкі новы прыземісты гмах з надпісам, здаецца, «Вярхоўны Савет». Нельга было дапусціць разбурэння касцёла — шэдэўра неагатычнай архітэктуры з яркімі элементамі раманскага стылю, святога месца сталічных каталікоў.

Ведаючы, што ў ЦК КП Беларусі і ва ўрадзе працуюць манкурты, я напісаў ліст у Маскву (ЦК КПСС і Саўмін СССР), у якім даказваў, што менскі Чырвоны касцёл Сымона і Алены — адметны архітэктурны помнік, што ён упрыгожвае пляц, увесь горад і з'ўляецца шэдэўрам гарманічнага спалучэння традыцый старадаўняга дойлідства і горадабудаўнічых навацый пачатку нашага стагоддзя. Я падкрэсліваў таксама, што касцёл збудаваны з цэглы, прывезенай з далёкай Англіі, што ён узведзены лепшымі майстрамі Беларусі паводле старажытных узораў і па сваёй прыгажосці нічым не саступае славутым храмам Германіі, Англіі, Францыі.

Неўзабаве мяне выклікалі ў гарвыканкам. Свой учынак я растлумачыў перш-наперш дзейсным сяброўствам з Беларускім добраахвотным таварыствам аховы помнікаў гісторыі і культуры. Са мной доўга гутарылі прадстаўнікі савецкай і партыйнай улады розных узроўняў. І ўсё ж яны, урэшце, пагадзіліся, што Чырвоны касцёл — помнік архітэктуры. Вельмі верагодна, што гэта выратавала касцёльны будынак ад знішчэння, які праз пэўны час ператварылі ў рэспубліканскі Дом кіно. Для мяне ж асабіста тым разам усё абышлося.

Да слова, так здаралася не заўжды. Яшчэ да згаданых вышэй радкоў з летапісу Чырвонага касцёла мяне за іншыя лісты дырэктыўным органам у абарону беларускасці выключылі ў 1956 годзе з КПСС і, адпаведна, знялі з пасады загадчыка Маладзечанскага РАНА. А сакратар Маладзечанскага абкама КП Беларусі Сяргей Прытыцкі сказаў на бюро: «Выключаем Вас з партыі за лісты нацыяналістычнага зместу, напісаныя ў Маскву. Адзінае, што будзе выканана з вашых патрабаванняў, гэта — узвядзенне помнікаў Скарыне, Купалу, Коласу, Багдановічу. Мы не зрабілі б і гэтага, але... нас абавязала Масква»

Зараз мы, сталічныя каталікі, молімся ў менскім Чырвоным касцёле, захапляемся цудоўнай касцёльнай акустыкай і архітэктурай. Паэты і кампазітары сёння складаюць аб ім песні. Таму варта, відаць, асвятліць некалькі малавядомых радкоў з летапісу гэтага храма.

Генадзь ЛАНЕЎСКІ,
ветэран вайны і працы,
інвалід Айчыннай вайны.
г.Менск.

ВУЧЫМСЯ

Мікалай КРЫЎКО

СЛОЎНІК СІНОНІМАЎ

ПАСТУПО́ВА (не адразу, не за адзін раз, а ў некалькі прыёмаў) *Самакрытыка паступова ахапіла доўгую палосу мінулага* (Гартны). *Паступова выступілі абрысы далёкіх дрэў, вынырнулі з туману хмызнякі, малады бярэзнік* (Шчарбатаў), **ПАВО́ЛІ** *Сонца ўзыходзіла ціха, туман разыходзіўся паволі* (Чорны). *Гул паволі сціхаў* (Пальчэўскі). *Рабочыя не адразу, а паволі пачалі заціхаць* (Пестрак), **ПАВО́ЛЬНА** *Калі на зямлю спускаюцца вячэрнія змрокі і, крадучыся, павольна ахінаюць сваім крылом зялёныя паркі і вуліцы Мінска, прыемна выйсці на шырокі праспект* (Хведаровіч). *Вечар. Павольна аціхаюць дзённыя гукі* (Ракітны), **ПАМА́ЛУ** *Камандзірава мара памалу збывалася: ужо напалову конны атрад мог хадзіць у даволі далёкія рэйды* (Якімовіч). *І гэтага апошняга «ну» бабачкі ўсё-такі паслухалі – скомчылі, сціснулі гоман свой і памалу змоўклі* (Зарэцкі), **ПАЦІ́ХУ** *Праз мост пантонны полк ішоў да рання. Не бачачы, што ён паціху тоне* (Гаўрусёў). *Лагер лесарубаў паціху засынаў* (Машара), **ПАТРО́ХУ** і **ПАТРО́ХІ** *Расходзіцца цемра патроху. Тхне вільгаць з нізін* (Колас). *Толькі пад восень стала патроху аціхаць, зацягвацца рана* (Мележ). *Незразумелыя, дзіцячыя мары ахопліваюць яго [Сымона]. – Эх, каб сабраць усе гэтыя гукі ў адно, – у сваю жменю, каб потым патрохі выпускаць іх адтуль кропелькамі* (Бядуля). *Ды ельнік спачатку радзей, потым яго патрохі змяніла бярозавае драбналессе* (Брыль), **ПАКРЫСЕ́** і **ПАКРЫХУ́** разм. *Хіма, якая доўга жыла нелюдзем, пакрысе зблізілася з суседзямі, зрэдку заходзіла і да Дашынай маці* (Ракітны). *Фільм канчаўся, і пакрысе аціхала музыка* (Вышынскі). *Хлопец мякка, па-дзявочаму, усміхнуўся і пакрыху стаў спакайнець* (Мележ). *Гэтая ўтоеная ацэнка пакрыху незаўважна пашыралася* (Шынклер), **СПАКВАЛЯ́** разм. *Ноч спакваля ахінала зямлю* (Асіпенка). *Суччо трашчала, языкасты Касцёр займаўся спакваля* (Лойка), **МА́ЛА-ПАМА́ЛУ** *Мала-памалу ад Сашкі ўсе адварочваліся, гублялі з ім дружбу і сяброўства* (Машара). *Пісьменнасць, занесеная з Поўдня, мала-памалу шырылася* (Шакун), **ПАТРО́ШКУ** і **ПАТРО́ШКІ** узмацняльнае *Патрошку страх Міхасёў зусім развеяўся* (Колас). *Мацей патрошку ўжываўся ў ролю гаспадара* (Пальчэўскі). *А ў руках басаножкі: Незнарок іх зняла, Каб адчуць, як патрошкі Сцежка стыць пачала* (Гілевіч), **ПАКРЫ́ШКУ** разм., узмацн. *Іх адносіны пачалі пакрышку наладжвацца. Шум пакрышку заціхаў*, **ПАМАЛЕ́НЬКУ** узмацн. *Памаленьку, патрошку раскрывалася таямніца чытання, граматы...* (Колас). *Сонца .. перапаўзло, хаваючыся за далягляд, на паўночны ўсход і спынілася, каб пачаць памаленьку вынырАць наверх* (Брыль), **ПАЦІ́ХЕНЬКУ** разм., узмацн. *Занадта ты гарачы, як я пабачу. Лепш паціхеньку, вобмацкам, збіраючы сілы, выраходваючы, а не без азірку, нагалам* (Гартны). *Так, седзячы на канапе ў сваім нумары, крыўдзілася яна [Вераніка Васільеўна] на Матвейцава, крыўдзілася, а потым паціхеньку і супакоілася* (Хомчанка).

ПАСТУ́Х (чалавек, які пасе статак) *Рана пачалося самастойнае Іванава жыццё падпаска, а пасля – панскага пастуха* (Дуброўскі). *Наперадзе замычалі каровы, пачуўся голас пастуха* (Ігнаценка), **ПАСТЫ́Р** паэтычнае *Доўга пастыр на трубе Пераліваe зару* (Танк). *На небе месяц, як пастыр, на плечы ўскінуўшы сярмягу, зганяе хмары ўсе ў Мазыр, каб паратунак даць на смагу* (Дубоўка).

ПАСУ́ДНІК (шафа для посуду) *Помніцца, тая [жанчына] таксама нешта казала і пра Германію, пакуль бразгала ў пасудніку і кроіла хлеб* (Быкаў). *На кухні.. адсвечвае белізной шыкоўны пасуднік з талеркамі і шклянкамі* (Аношкін), **СУ́ДНІК** *[Грасыльда] больш нічога не сказала, адышлася з лыжкай да судніка і забразгала пасудай* (Пташнікаў). *Надвечар, падаіўшы карову, Арына стала ўпарадкоўваць малако. Заліла глячкі, схавала ў суднік пад замок* (Масарэнка).

ПАСУ́НУЦЦА (падацца наперад з варожым намерам) *Няхай цяпер толькі пасунуцца фашысты ноччу ў вёску, як адразу тут жа будуць і яны [партызаны]* (Шамякін). *[Кашын] адштурхнуў нагою скрынку, усхапіўся і, чырвоны як рак, пасунуўся на сына* (Карпаў), **ПАТКНУ́ЦЦА** разм. *А калі і паткнуцца [фашысты], – возьмем стрэльбы ды так іх спаткаем, што касцей не збяруць* (Мележ). *«Ну, – думаў я пра Дзяміда, – няхай толькі паткнецца, цецярук глухі. Дадзім яму прачуханца»* (Кухараў), **СУ́НУЦЦА** разм. *Спрабавалі карнікі сунуцца ў лес, але партызаны так іх паперлі назад, што больш і носа баяліся паказаць туды* (Кірэйчык). *– Ды я на парог яго [Ігара] не пушчу, дачушка!.. Ды я яго памыямі абалью, калі сюды сунецца! – горача паклялася маці* (Сіняўскі). *– Незакончанае трыванне:* **Су́нуцца, патыка́цца.**

ПАСЦІ́ЦЬ (прытрымлівацца посту, устрымлівацца ад скаромнай ежы) *[Маці:] – Ты ж толькі першы тыдзень пасціў, а на другі ўжо і не вытрываў. Паеў заскваранага булёну, у паездцы* (Ус). *Рыгор прымушаў Тэклю і Галену пасціць піліпаўку і вялікі пост, каб сала менш разыходзілася* (Чорны), **ПО́СНІЧАЦЬ** *Завядзёнка тады яшчэ ў людзей такая была: увесь год можаш поснічаць, а на каляды ці на вялікдзень абавязкова разгавецца свежынаю* (Сабаленка). *[Верасневіч:] Англія бярэ першае месца па посту! Сусветны чэмпіён Атніксон посціцца шаснаццаты дзень!..Гэта што, я знаў чалавека, які поснічаў пятнаццаць год* (Мурашка), **ПО́СТАВАЦЬ** разм. *– Хлопцы, у каго-небудзь акрайца хлеба не знойдзецца? А то мы з Тацянай з учарашняй раніцы постуем* (Шамякін), **ГАВЕ́ЦЬ** *Трэба ведаць, знаці Службы гараванне: Позна легчы спаці, а ўстаці заранне.. Заціркай найболей Гавець, разгаўляцца* (Купала). *Карацей, праз час каторы Не пазнаць Ігната проста: Ён гавее, ён пасціцца* (Валасевіч). *Без гарачай стравы хіба адзін толькі Булыга гавее* (Бажко).

Леанід БУРАК,
заслужаны работнік народнай адукацыі Беларусі, доктар філалагічных навук, прафесар

УДАКЛАДНІМ

ЗНАКІ ПРЫПЫНКУ Ў СКЛАДАНАЗАЛЕЖНЫХ СКАЗАХ

і) Складаназалежныя сказы з даданымі часткамі ўмовы

1. Даданая частка ўмовы, якая звязана з галоўнай часткай складаназалежнага сказа адзіночнымі злучнікамі **калі, як, каб, раз, абы, толькі** і размешчана пасля яе, заўсёды аддзяляецца коскай: *Шмат спарней працаваць калектывам, калі ёсць малатарні такія...* (П.Глебка). *Усё было б добра, каб не дожджж...* (Якуб Колас). *Я памылку выпраўлю, абы толькі паправіцца* (Кузьма Чорны). *Кліча цябе неспакойнае шчасце, толькі хутчэй да яго даплыві* (С.Грахоўскі).

2. Калі даданая частка ўмовы размешчана перад галоўнай часткай, але інтанацыйна і сэнсава не выдзяляецца ў сказе, то паміж гэтымі часткамі ставіцца коска: *Калі развітальную песню пяюць журавы, дажджом ападаюць іх слёзы* (Максім Танк). *Каб слава дружыла з табой праз гады, ты з праўдай зрадніся, мой сын, назаўжды* (А.Бялевіч). *Раз у полі справы многа, мы дадому не ідзём* (М.Машара).

Калі ж даданая частка ўмовы суправаджаецца ўзмоцненай інтанацыяй, то яна аддзяляецца ад галоўнай часткі пры дапамозе працяжніка: *Калі сонца не ўзыходзіць – над сусветам цьма* (А.Русак). *Калі дружба ёсць – пахмурны дзень ясным сонцам свеціцца наўкола* (А.Астрэйка). *Раз вясна – усюды светла* (Якуб Колас).

Пры асабліва ўзмоцненай інтанацыі і лагічным расчляненні складаназалежнага сказа на дзве часткі з працяглай паўзай і аслабленай сувяззю паміж імі можа ставіцца коска з працяжнікам: *Калі кране маланка хмару, – яна грыміць* (Максім Танк). *Калі мінулых дзён не забываеш, – ты любіш дзень сягонняшні мацней* (Эдзі Агняцвет).

3. Даданая частка ўмовы, якая звязана з галоўнай часткай складаназалежнага сказа парнымі злучнікамі **калі — дык, раз — то, як — то** і інш., заўсёды аддзяляецца пры дапамозе коскі: *Калі па лесе праходзілі лагодныя павевы ветру, то галінкі і лісце на іх лёганька пакалыхваліся* (Якуб Колас). *Як воўка баяцца, то ў лес не хадзіць* (К.Крапіва). *Раз хмары ходзяць над зямлёй, то хутка дожджж пачнецца* (М.Клімковіч). *Раз прыехалі госці, дык частаваць іх трэба* (Кузьма Чорны).

к) Складаназалежныя сказы з даданымі ўступальнымі часткамі

1. Даданая ўступальная частка, якая звязана з галоўнай часткай складаназалежнага сказа злучнікамі **хоць (хаця), няхай (хай), дарма што** і інш., аддзяляецца пры дапамозе коскі: *Юрка хлопчык ужо вялікі, хай сабе замала год...* (Янка Купала). *Чалавек шпарка завіхаўся на сваім двары, дарма што ён быў ужо немаладога веку* (Міхась Зарэцкі). *Не хацелася снедаць, як маці не ўпрошвала* (Цішка Гартны).

2. Калі даданая ўступальная частка звязана з галоўнай часткай складаназалежнага сказа пры дапамозе складанага злучніка **нягледзячы на тое, што**, то яна заўсёды аддзяляецца коскай; прычым коска ставіцца таксама і перад кампанентам **што**, паколькі гэты злучнік часцей за ўсё распадаецца на дзве часткі: *Нягледзячы на тое, што на двары ідзе дожджж, Крушынскі збіраецца ехаць у горад* (Змітрок Бядуля). Але: *Нягледзячы на тое што прыказкі і прымаўкі самастойна не бытуюць, яны не трацяць ад гэтага свайго самастойнага значэння* (Кандрат Крапіва), дзе злучнік **нягледзячы на тое што** не распадаецца.

3. Калі для сувязі даданай і галоўнай частак складанага сказа ўжываюцца парныя злучнікі **хоць — але, хоць — ды, што ні — а, куды ні — а** і інш., то гэтыя часткі заўсёды аддзяляюцца коскай: *Хоць малы яшчэ гадамі, а працуе ён адметна* (П.Броўка). *Хоць складанае пастаўлена пытанне, але просты на яго адказ* (П.Глебка). *Што ні кажыце, а хлопец ён слаўны!* (Якуб Колас). *Колькі вяровачцы ні віцца, а канец павінен быць* (Прыказка). *І як ні кляў ён гэту п'яўку, ды мусіў даць рубля за спраўку* (Якуб Колас).

Калі кампаненты **а, але, ды** ў такіх злучніках адсутнічаюць, то пры звычайнай інтанацыі паміж галоўнай і даданай часткамі таксама ставіцца коска: *Хоць снег трымаўся яшчэ на палях, сонца прыгравала з кожным днём усё мацней і мацней* (М.Лынькоў). *Няхай сабе работа была нялёгкая, бадзёрасць не пакідала моладзь* (П.Броўка). *Хоць ад ракі цягнула свежасцю, вогнішчаў не раскладалі* (Кузьма Чорны). *Як ні ўглядаўся малы ў неба, нічога там не было відаць* (А.Стаховіч).

Але калі даданая частка інтанацыйна і сэнсава выдзяляецца ў сказе, то яна аддзяляецца ад галоўнай часткі пры дапамозе працяжніка: *Хоць змерклася даўно – святла ў доме чамусьці няма* (Кузьма Чорны). *Куды ні глянь – усё бялютка* (Якуб Колас). *Як ні сорамна – прыйдзецца прызнацца* (Цішка Гартны).

Пры асабліва ўзмоцненай інтанацыі і лагічным расчляненні складаназалежнага сказа на дзве часткі з працяглай паўзай і аслабленай сувяззю паміж імі можа ставіцца коска з працяжнікам: *Няхай імя яго было нам невядома, – мы неслі ўсе яму свой лепшы шчыры дар* (П.Глебка). *Няхай навальніца шалее над светам, – гатовы спаткаць мы разгон увесь бур* (М.Машара). *Хто б ні ехаў ці ішоў па шырокім гасцінцы, – усе ведалі сядзібу Астаповіча* (Кузьма Чорны).

КУЛЬТУРА МОВЫ

ЦІ Ж ГЭТА НАША?

— Валодзя, а як даўно ты ў Амерыцы? («Народная газета», 19.V.1993 г., інтэрв'ю Леаніда Пранчака з Уладзімірам Крывіцкім).

«Локшына» для Шушкевіча, ці да пытання пра тое, як доўга яшчэ буда-кашалёўскія мутанты будуць заставацца каля стырна ўлады («Звязда», 25.VIII.92).

Як хутка будзе прыватызацыя? Як часта вы слухаеце Беларускае радыё? (з радыёперадач).

Як хутка адбудзецца дэмілітарызацыя мяжы між Беларуссю і Літвою («Звязда», 25.VIII.94...)

А вось як доўга кіраваць — гэта ад вашай рашучасці залежыць. («Свабода», 20. IX.94. «Савецкага Саюза і я будзе, Аляксандр Рыгоравіч»).

Як доўга яшчэ працягнецца рэстаўрацыя? («Народная газета», 2.VIII.91).

Такія прыклады можна множыць і множыць — з пісьмовай, з вуснай мовы.

Спытаецеся, а што тут такое? Вось якраз у тым і бяда, што мы ўжо і не заўважаем, што карыстаемся не сваім сінтаксісам. Ці ж па-беларуску гэтае *«як даўно?»*, *«як хутка?»*, *«як доўга?»* Не! У нашай мове ўсё гэта гучыць больш проста і натуральна. Працытаваныя тут прыклады павінны былі прагучаць па-беларуску так: «**Валодзя, а ці даўно ты ў Амерыцы?»**

«Локшына» для Шушкевіча, або да пытання, ці доўга яшчэ буда-кашалёўскія мутанты будуць заставацца каля стырна ўлады?..

Ці хутка будзе прыватызацыя?..

Ці часта вы слухаеце Беларускае радыё?

Ці хутка дэмілітарызацыя..?

А вось ці доўга кіраваць — гэта ад вашай рашучасці залежыць.

Прыслухаймася да жывой мовы! Пачытайма нашых класікаў, якія пісалі жывой мовай, ведалі яе. У іх скрозь будзе: «**Ці даўно вы былі дома?**», «**Ці хутка тое будзе?**» Згаданыя спалучэнні — калька з расейскай мовы — «как давно?», «как скоро?», «как долго?» Най-часцей іх можна пачуць у гутарках, у інтэрв'ю...

Думаецца, не па-беларуску гучыць і такое спалучэнне: *«з чаго?»* — у значэнні: *«чаму вы так думаеце?»*

Цытую цалкам гэтае спалучэнне ў кантэксце:

— У цябе што — непрыемнасці?


— Ніяк не, — па даўняй армейскай звычцы адказвае яму былы прапар. — У мяне ўсё ў парадку. З чаго вы ўзялі? («Звязда», 22.VIII.94.«Анекдот» — аўтар Вячаслаў Гілевіч). Думаецца, беларус з беларускім мысленнем так не можа гаварыць. Ён мусіў бы сказаць: «**Чаму вы так думаеце?**» А «**з чаго ўзялі?**» — гэта хіба калі гаворка ідзе пра штосьці канкрэтнае. Прыкладам, можна так спытацца пра якуюсь рэч, якая ў нечым ляжала, а суразмоўца ці сумоўца хоча высветліць, адкуль, з чаго тую рэч узялі: ці з рэшата, ці з кошыка, ці яшчэ з чаго.

Вось такія нюансы нашых братніх моў: што ў адной гучыць натуральна, то ў другой здаецца дзівосным. І наадварот. І з гэтым трэба лічыцца. Беларус усё ж думаў і думае па-свойму. У яго і шмат якія словы, хоць і аднолькава гучаць з расейскімі, скажам, *шынель, медаль, мазоль*, адрозніваюцца родам. Гэта ўсё ды і шмат што іншае гаворыць: беларус заўсёды быў беларусам, а нікім іншым. Ён па-свойму ўспрымаў і ўспрымае навакольны свет; яму па-свойму чулася і чуецца слова, інакш, чым расейцу ці якому іншаму нашаму суседу. У яго сваё адметнае мысленне. То пакіньма яму гэта ўсё ў яго мове. Хай беларус заўсёды будзе беларусам! Яму і так давялося зведаць усяго за тысячагоддзі. І імя яму не раз мянялі. Быў ён русінам, быў і літвінам, быў і беларусцам. Давялі аж да тутэйшага. Дайце ж яму хоць цяпер акрыяць! Не каламуцьце яго душы! Не каламуцьце яго мовы. У ёй і так ужо шмат усялякай брыды!

Уладзімір СОДАЛЬ.

КАЛАСАВІНЫ—94

ЦЁМНЫЯ ЛЯДЫ Ў ЖЫЦЦІ ЯКУБА КОЛАСА



Сын лясніка, Якуб Колас вымушаны быў разам з бацькамі вандраваць з аднаго месца ў другое. Акінчыцы, Мікалаеўшчына, Ласток, Альбуць, Цёмныя Лядьі, Смольня... Кожная мясціна мае сваю адметнасць. У Акінчыцах у 1882 г. будучы паэт нарадзіўся, і калі яму яшчэ не было і года, палясоўшчык Міхал пераехаў у Мікалаеўскую лясную камору, дзе сям'я жыла да 1 красавіка 1885 г. З 1885 г. па 1890г. Міцкевічы жылі ў Ластку (Сухошчыне). Якуб Колас пазней успамінаў: «Сваё дзяцінства я добра памятаю з таго часу, калі бацька служыў на трэцім месцы...»

Пасля смерці Міхала, бацькі паэта, цяжар службы лесніка ўзваліў на свае плечы старэйшы брат Якуба Коласа — Уладзімір. У 1904 годзе ён перабраўся з маці ў леснічоўку — Стаўпецкую лясную камору, што мясцілася паблізу чыгункі Мінск — Брэст, непадалёку ад Стоўбцаў. Назву гэта месца мае Цёмныя Ляды, ці як яшчэ называюць — Смалярня. Сёння, на жаль, пабудовы гэтай леснічоўкі не захаваліся. Згодна інвентарнага апісання вядома, што там была хата (18 х 10 х 4) на каменным падмурку з абчасанага бярвення, у просты вугал, крытая гонтай, пры падоўжнай сцяне ганак на зрубе, крыты гонтай, з двума апорнымі слупамі. У сярэдзіне — сенцы, святліца і кладоўка, якую можна лічыць за другую палову хаты. Печ з камінкам, столь дашчаная, падлога гліняная. На сядзібе было гумно, абора, прыгрэбнік, крытыя гонтай. Дворышча абгароджана парканам з хваёвых круглякоў.

Сюды, у Цёмныя Ляды, прыязджаў, верагодна, Колас улетку, калі працаваў на Палессі, і з Верхменскага народнага вучылішча. Найбольш працяглы час жыў паэт тут пасля нелегальнага з'езда настаўнікаў, які адбыўся 9 ліпеня 1906 г. на Прыстаньцы, бліз Мікалаеўшчыны, і за які настаўнік Міцкевіч быў звольнены са службы, а затым асуджаны на 3 гады турэмнага зняволення. Вось у гэты час — зімой 1906—1907 гг. — і жыве Якуб Колас у старэйшага брата Уладзі. Жыве на паўлегальным становішчы, адкрывае нелегальную школу, дзе займаецца з 12 вучнямі. Пачынае складаць кнігу для другога года навучання ў беларускай школе «Другое чытанне для дзяцей беларусаў».

Паводле ўспамінаў сястры Якуба Коласа Юзэфы Міхайлаўны: «Зіму Костусь пражыў у Смалярні, у Уладзіка. Вучыў дзяцей. Вясной хадзіў у Стоўбцы з імі на экзамен. Многа пісаў». Калі перагартаць газету «Наша ніва» за 1906—1907 гг. з першага яе нумара (а пачала яна выходзіць з 10 лістапада 1906 г.), то ўпэўніваешся, што ў кожным нумары змешчаны вершы і артыкулы Якуба Коласа пад рознымі псеўданімамі: Тамаш Булава, К.Альбуцкі, Мікалаевец, Лесавік, Як, Дзядзька Карусь. За кожным яго радком — боль за свой край, сваіх людзей, якія не бачаць свята і радасці за работай, а жывуць у галечы. Так, 8 снежня 1906 г. за подпісам «Мікалаевец» газета змясціла такія нататкі аб в.Мікалаеўшчына: «Нудна ў нашым сяле. Сэрца абліваецца крывёй, як прыглядзішся да жыцця нашага мужыка-небаракі. Дзівішся трэба, як можна выжыць у такой беднасці. Пакутуюць людзі...» Але ўпэўненасць у зрухі да лепшага не пакідала паэта. Нават у тыя яшчэ маладыя гады ён быў прадбачлівым, мудрым, ужо тады змагаўся за правы звацца Беларусам, за чысціню і захаванне мовы народа. Не выпадкова з'явіўся яго водпіс «**Беларуская мова ў казённай школе**» («Наша ніва», 1906 г., № 7) за подпісам Дзядзька Карусь, дзе з болем гаворыцца аб стане беларускай мовы: «...цяпер, як беларусам далі права гаварыць і пісаць на сваёй мове, і як паявілася першае беларускае пісанае слова, багата знайшлося праціўнікаў беларускай мовы. Адны кажуць: «Нашто беларуская мова? Нашто падымаць яе з магілы?» Другія гавораць, што мова беларуская брыдкая мова... І многа чаго гавораць праціўнікі беларускай мовы. Адкуль жа гэтакія нападкі на беларускую мову? Што іх парадзіла? Чаму беларуская мова «мёртвая» мова? Чаму рэжа яна вушы нават таму ж самаму беларусу, каторы выйшаў з простага народа, інтэлігенту-беларусу? Каб адказаць на ўсё гэта, трэба быць знаёмым з гісторыяй нашага краю, з характарам унутранай расейскай, казённай палітыкі. Аб гэтым гаварыць пакуль што не пазваляе многа прычын. Скажу толькі, як выкоўваецца беларус-інтэлігент, каторы потым цураецца свайго ўсяго роднага.

Маленькі хлопчык-беларус вучыцца ў школе. Цэлых пяць або і шэсць год ходзіць ён у школку. Ці чуе ж ён там сваё роднае слова? Не. Ён чуе адну толькі насмешку над сваёю моваю; а забудзецца часта, вырвецца ў яго сваё роднае слова, тое слова, каторым прывык ён ад пялёнак гаварыць з таткаю і з маткаю, — вучыцель, а за ім і ўсе вучні падымаюць яго на смех. А другі вучыцель яшчэ перадражніць, перакрывіць яго.

Бедны хлопчык спачатку нават не ведае, што ён злога зрабіў, што крывяць яго і смяюцца з яго...

Не, галубочкі! Не беларуская мова рэжа вам вушы, скрабе душу, а рэжа вам вушы і скрабуць вашу душу тыя далёкія ўспамінанні смеху над вамі, якім сустракалі ваша слова ў школе. За ўсе часы вашага вучэння высталялі на смех беларускую мову, тапталі ў балота ўсё ваша роднае. Не сваімі вачамі глядзіце вы на беларуса, не сваімі вушамі прыслухоўваецеся вы да яго мовы. От чаму беларуская мова здаецца вам нехарошаю.

Што раз памёрла, тое больш не жыве. А што жыве, тое не памёрла. Не называйце ж беларускай мовы «мёртваю моваю».

Як беларуса ні жалі, як яго ні душылі, як ні тапталі яго ў балота, усё ж такі ён захаваў сваю мову. І вы адбіраеце права ў беларуса чытаць кніжкі і газеты на роднай мове; і гэтае права адбіраюць тыя, хто быццам стаіць за свабоду народа!

Эх, браткі! Вы едзеце на двух вазох, а спяваеце адну песню. Корміце адну карову, а доіце дзве. Ставіце свечку Богу і моліцеся чорту. Нестае яшчэ толькі таго, каб паехалі вы ў Вільню і сталі там на калені прад адным памятнікам...»

Як выдатны педагог і псіхолаг, Колас разумеў, што пачынаць выхаванне свядомасці неабходна з дзіцячага ўзросту. Толькі своечасова закінуўшы зерне пашаны да ўсяго роднага ў маладую душу, можна чакаць добрага ўраджаю. Кніга «Другое чытанне для дзяцей беларусаў» не можа не выклікаць пачуцця гонару за свой край, сваіх людзей, не пакінуць добры след у сэрцы кожнага, хто яе бярэ ў рукі.

Лёсам было наканавана Якубу Коласу пэўны час жыць у глухім урочышчы Цёмныя Ляды і не выключана, што і не з'явілася б гэта чытанка для дзетак, калі б жыццёвыя сцяжыны не прывялі яго ў гэты забыты Богам куток, калі б не тулялся паэт у чаканні свайго лёсу пасля настаўніцкага з'езда.

У трылогіі «На ростанях» Якуб Колас вуснамі Андрэя Лабановіча выказаў мэту свайго жыцця, нягледзячы на цяжкую часіну: «Дык наперад, брат, наперад! Пракладай сабе дарогу ў жыцці, не зважаючы ні на якія нягоды, дарогу прасторную, ясную, з бясконцымі краявідамі і далячынямі, і склікай народ на гэту прасторную дарогу!»

Зінаіда КАМАРОЎСКАЯ,
дырэктар Літаратурнага музея Якуба Коласа.

МАТЭРЫЯЛЫ ДА СЛОЎНІКА «БЕЛАРУСКІЯ ІМЁНЫ»

МАЛЫЯ КЛОПАТЫ ВЯЛІКАГА ВІТАЎТА

Адразу папярэджу, што гаворка пойдзе не пра славутага волата нашай зямлі князя Вітаўта Вялікага, а пра звычайнага дарослага Вітаўта, які ледзь не стаў жыццёвым прыкладам для Вітаўта малога, што нарадзіўся ў адной беларускай сям'і. Карацей кажучы, у артыкуле У.Слабіна «Вялікі клопат з малым Вітаўтам» я знайшоў падставу азваца яшчэ і таму, што аўтар той публікацыі згадвае і маю асобу.

Цудоўна разумею праблемы чалавека, беларускае жыццё якога не скончваецца на працы або на публічных зборах. Ён хоча ў сваёй дзяржаве адчуваць сябе ўтульна і па-свойску, таму, не здольны перабудаваць дзяржаву, будуе па-беларуску сваю сям'ю.

Хачу супакоіць шаноўнага У.Слабіна, што многія праблемы, з якімі ён — дзякаваць Богу — паспяхова змагаецца, стварае ён сам у сваім уяўленні. Ён выбірае імя свайму сыну, хоча, каб яно не стала сімвалам ЧАЛАВЕКА НАТОЎПУ, а ў той жа час баіцца стварыць «белую варону», засцерагаецца, «што скажуць людзі». Ды што пытаць у гэтых людзей, якія ў сваёй роднай краіне Янкаў, Кастусёў, Францішкаў сарамліва парабіліся ўсе Іванамі... Дык што, замест «белай вароны» стаць бруднай варонай, каб у зграю прынялі?

У.Слабін піша, як шукаў адметнае імя для сына, як падмацоўваўся аргументамі і раптам (о трагедыя!?) «жонка прыгадала, што ў 1988 годзе Вітаўт Мартыненка друкаваўся ў «Чырвонай змене» як Віктар, а Чаропку таксама западозрылі ў псеўданіме».

Не, дарагія мае, гэта не псеўданім, хоць у «капусных» нашых пашпартах пазначана Віктар. Калі нашыя бацькі давалі нам імёны, над імі бадай што вісеў Дамоклаў меч. Нават я ўжо ў юнацтве быў сведкам, калі мая цётка хацела назваць дачку Янінай, а чыноўныя цэрберы свавольна ў дакументах перайначылі імя на Ніну.

А вось больш свежы ўспамін. Вы думаеце лёгка было працягнуць на старонкі «Чырвонай змены», якую вы згадваеце, беларускае імя. Я зайздросціў маім калегам Сашу Д., Канстанціну Ф., беларускія формы імёнаў якіх лічыліся легальнымі. Яны лёгка падпісваліся Алесь Д., Кастусь Ф., і ніхто іх не чапаў. Я неяк напісаў *Вітаўт Мартыненка*, дык мала што выйшла ў свет проста *В.*, але ж і на лятучцы мяне разбіралі за «нацыяналістычныя выверты».

Неўзабаве ўдалося і мне «засвяціцца» і менавіта ў форме жартоўнага псеўданіма: адну з сваіх гумарэсак я падпісаў Вітаўт Мартыненка-Прыняміжны (я ж быў тады «пры рок-клубе «Няміга»). Потым удалося яшчэ пару разоў, калі рэдактар быў у адпачынку. Потым я нелегальна ўнёс папраўку без ведама рэдактара. Вось так: чытачы ўжо раз за разам бачылі на старонках газеты беларускае імя, і наўрад ці хто здагадваўся, што Вітаўта пад стрэльбамі, пад вымовамі, пад пагрозай звальнення за свавольства прымушалі быць Віктарам.

Змяніліся рэдактары ў «Чырвонай змене», а разборкі «за правы напісання імёнаў» усё не сціхалі. Часам ціск быў настолькі моцны (а гэта ж быў ціск пашпартам!), што ў энтузіястаў беларушчыны заставаўся толькі адзін шанц — права на псеўданім. А было нават забараніліі і псеўданімы.

Мяне асабіста перасталі чапаць крыху раней, чым іншых. Чаму? Справа ў тым, што ў 1989 годзе ў ЗША выйшла кніга Вітаўта Мартыненкі, а ў 1991 на радыё «Свабода» з'явіўся карэспандэнт Вітаўт Мартыненка. Дарэмна было сціскаць ваду ў кулаку.

Сёння ж, стаўшы намеснікам рэдактара расійскамоўнай газеты «Кинонеделя Минска», я застаюся беларусам не толькі ў тэме публікацый, але і ў напісанні імені: *Вітаўт Мартыненка*. Ніякіх *енко*, ніякіх *овт*. А тым болей ніякага *ольд*.

Дарэчы, дзякуючы вяртанню свайго нацыянальнага «Я» ўімені з цягам часу я знайшоў сваю, як кажуць, другую палову. З сімпатычнай гамяльчанкай мы пазнаёміліся, зрэшты, на канцэрце беларускага ансамбля «Васілёк» з Нью-Йорка, але потым я даведаўся, што яна даўно прыглядалася да маіх публікацый і з зайздрасцю думала: «Во ў людзей імёны, проста цуд». Праўда, калі прыспеў час убачыць мой пашпарт, наступіла расчараванне: там было пазначана шэрагавае ды празаічнае Віктар.

Але праблему гэтую мы вырашылі хутка: як толькі народзіцца сын, ён будзе Вітаўтам ад першага дакумента. Цэлы год мы жылі чаканнем Вітасіка, а нарадзілася дачка. Хоць ты Вітасяй яе назаві.

Зрэшты, не бяда ж на нас звалілася. Я і думаў, што будзе ў маёй сям'і і сынок, будзе і дачушка. Неяк з жонкай слухалі польскую кружэлку з запісам гумарэсак Пятра Франчэўскага і Яна Петшака. Там ёсць такая сцэнка:

«— Як завуць вашую жонку, шаноўны?

— Альдона.

— Альдона? Навошта ж сапраўднаму паляку жонка са старалітоўскім імем? Вы хіба на віцебскі трон пад герб «Пагоня» прэтэндуеце?..»

Тады і падумалі мы: «Вось яно, нашае!»

У Заводскім ЗАГСе г.Менска нас сустрэлі даволі ветліва, хоць і без асаблівага імкнення паразумецца.

— Что, ребенка зарегістрировать хотіте? Пожалуйста. А что это за імя такое — Альдона. В словаре его нет. Мы напішем Лена, а вы уж называйте, как хотіте.

У адрозненне ад сп. У.Слабіна я не стаў шукаць лепшага моманту для паразумення, бо вопыт маіх сваякоў падказваў мяне да ўсялякіх неспадзяванак. Я цвёрда адрэзаў:

— Калі вы будзеце рэгістраваць сваё дзіця, дык хоць Клуняй назавіце... Каб захацелі мы запісаць у гэтым радку Кветка, дык вы гэтак і запісалі б. Інакш я парву дакумент і не заплачу за працэдуру. Не ў турме ж жывём, правы маем. Так што пішыце Альдона і, калі ласка, усе запісы — на дзяржаўнай мове.

Гэта быў другі (пасля шлюбнага пасведчання) беларускі дакумент нашай сям'і, які сведчыў, што нарадзілася сп. Мартыненка Альдона, дачка Вітаўтава.

Дзякаваць Богу, нашых сваякоў, сярод якіх былі і рабочыя, і сяляне, і службоўцы, нікога асабліва не спатрэбілася пераконваць, што прыгожае імя Альдона — беларускае. Усім яно прыйшлося да слыху і да душы. Хіба толькі цікавіліся некаторыя: «А адкуль, а калі?..» Тады мы ім давалі пачытаць знойдзеную пазней вырэзку газетнага артыкула «Каралева вартая Польшчы» пра беларускую дзяўчыну Альдону, якая трапіла на польскі двор, спадабалася іхняму каралю і... выйшла за яго замуж, ахвяраваўшы, праўда, сваім імем, бо палякі перахрысцілі яе ў Анну.

Нашай Альдонцы мы не сурочым ні польскіх каралёў, ні расейскіх цароў. Спадзяёмся, што спраўдзіцца прароцтва Купалы і на гэтую зямлю прыйдзе СВОЙ УЛАДАР. А пакуль...

Думаеце ў гэткае міжсезонне на Альдону глядзяць сёння як на белую варону тыя, з шэрага каго яна вылучаецца? Зусім не. На яе глядзяць, як на князёўну, бо яна ўпэўненая ў сабе. Бацькі не перадалі ёй дурацкіх сумненняў: «А мо ня гэтак? А то трэба і вашым і нашым. Мо для сваіх будзеш Альдонай, а для натоўпу прытрымаем у запасе Алёнку ці Дуньку?..» Дарэчы, і ў мове гэтае двухгадовае дзяўчо ў беларускамоўным садку адчувае сябе больш упэўнена, чым нават выхавацелі, якія часам вучацца ад яе. Дык хіба не князёўна? Асабліва заваражвае некаторых чароўнае «...дона»... Гэта вам не «Маша», «Глаша»...

Так што з Альдонай — ніякіх клопатаў, калі не выдумляць іх самім. Вось толькі каб дзяржава не прадавала нам слоічак дзіцячага харчавання за кошт дзённага заробку дарослага чалавека, можна было б хутчэй узбагаціць Беларусь Вітасікам, Рагнедай, Адольфам, Францішкам... Каб не было самотна беларусам у Беларусі.

Вітаўт МАРТЫНЕНКА.



ЮБІЛЕІ

Сваё 50-годдзе адзначыў беларускі ліцэй у Бельску-Падляскім

Усе гэтыя гады ён быў не толькі навучальным, але і культурным цэнтрам беларусаў Польшчы.

Вялікае значэнне ў ліцэі надаюць сувязям з Беларуссю. Гэта — кантакты з адной са школ Слоніма, супрацоўніцтва з Беларускім фондам культуры, навучанне выпускнікоў ліцэя ў вышэйшых навучальных установах Беларусі.

У дні юбілею адбылася сустрэча выпускнікоў ліцэя, а таксама адкрыццё мемарыяльнай дошкі — дара ліцэю Міністэрства культуры Беларусі і Савета Міністраў Беларусі.

Я.КАЗЮЛЯ, Белінфарм.

СТВОРЫМ ГІМН БЕЛАРУСІ РАЗАМ

ЖЫВЕ БЕЛАРУСЬ!

1. Мы, беларусы, — вольныя людзі!
2. Вольным заўсёды будзе наш шлях.
3. Сімвал свабоды — Сцяг Беларусі,
4. Бела-чырвона-белы наш Сцяг.

5. Хай жа ніколі ён не загіне!
6. Бог захавае Белую Русь.
7. Наша адданасць — Вольнай Радзіме.
8. Хай жа заўсёды жыве Беларусь!

9. Праца народа моц і свабоду —
10. Годнасць гартуе з году ў год...
11. Веліч Радзімы — мужнасць народа,
12. Люд Беларусі — слаўны народ.

13. Хай жа ніколі ён не загіне!
14. Бог захавае Белую Русь.
15. Наша адданасць — мілай Радзіме.
16. Хай жа заўсёды жыве Беларусь!

17. Край наш багаты, шчодры, дзівосны,
18. Рэкі павольныя, светлыя тут.
19. Мірна гамоняць бярозы ды сосны...
20. Цешце, нашчадкі, родны наш кут!

21. Хай жа ніколі ён не загіне!
22. Бог захавае Белую Русь.
23. Наша адданасць — мілай Радзіме.

Ад рэдакцыі. Паўтараем тэкст верша У. Жыгалкі, які ён прапанаваў дапрацаваць грамадою, каб такім чынам стварыць Гімн Беларусі. Радкі вырашана пранумараваць дзеля зручнасці спасылкі на іх у далейшым. Напамінаем: кожны, хто бярэ ўдзел у дапрацоўцы тэксту, можа ў межах агульнай задумы верша дасылаць уласныя варыянты радкоў ці асобных слоў, а таксама падтрымліваць альбо крытыкаваць заўвагі і варыянты іншых удзельнікаў сумеснай працы над тэкстам. Публікуючы іх, мы ўстрымліваемся ад рэдакцыйных каментараў. Дапрацоўка тэксту У.Жыгалкі па просьбе чытачоў працягнута да канца года. Чакаем вашых лістоў, шаноўныя чытачы!

* * *

Паважаная рэдакцыя!

З вялікай цікавасцю прачытаў пра ініцыятыву газеты «Наша слова». Такая прапанова мне вельмі спадабалася — на старую мелодыю стварыць разам новы Гімн. Прапаную свой пасільны ўклад у гэтую працу. Асаблівую ўвагу я звяртаю на тое, каб змест Гімна служыў справе патрыятычнага выхавання моладзі

Іван ЕМЯЛЬЯНАЎ, *ветэран вайны і працы.*
г.п.Сураж, Віцебшчына.

МЫ, БЕЛАРУСЫ

Мы, беларусы, — вольныя людзі!
Вольна і ў згодзе жадаем мы жыць.
Хай будзе мірным неба над намі,
А яснае сонца наш шлях азарыць.

Мы — мірныя людзі і патрыёты,
Радзіму любілі і будзем любіць.
А клікне Айчына — мы мужнымі будзем
І станем у шарэнгі яе бараніць!

Мы любім яе, Беларусь нашу родную,
Бацькоўскага краю зялёны прастор,
Лясы і даліны, палі залатыя,
І ясную гладзь паўнаводных азёр.

Слаўся ж у вяках, Беларусь наша родная!
Квітней і мацней з году ў год!
Табой ганарыцца будзе заўсёды
Наш працавіты і мужны народ.

* * *

Шаноўная рэдакцыя!
Прапаную:
Радок 7 замяніць на словы: «Наша «Пагоня»— сімвал Радзімы».
9. Нашы імкненні — моц і свабода —
10. Шчасце гартуюць з году ў год...
11. Веліч Радзімы — мужнасць народа,
12. Міра жадае слаўны наш род.
18. Рэкі, як мова, прыгожыя тут

З пажаданнем поспехаў

Э.ТОЗІК.
г.Калінкавічы.

* * *

Іван БАСЕЦКІ
По матывах тэксту, прапанаванага рэдакцыяй

МЫ—БЕЛАРУСЫ!

Мы — беларусы! Сонца свабоды
Зноў асвятляе ўхабісты шлях.
Будзе-краіна вольнай заўсёды
Ў свеце прызналі Герб наш і Сцяг.
Прыпеў: Ты нам і маці, і песня, і слава,
Працаю годны кожны твой род,
Хай жа квітнее наша дзяржава,
Мірна жыве беларускі народ.

Хай жа Купалы, Коласа слова
Нас заклікае да лепшых падзей
З намі навекі родная мова,
Край памяркоўных мудрых людзей.
Прыпеў.

Увысь узнімайся, мірнае сонца,
Гонар і годнасць сплятайма ў вянкі
І, як малітву, кажам бясконца:
— Жыве Беларусь праз гады і вякі!
Прыпеў.

г.Менск.

Віктар ГОЛУБ
По матывах прапанаванага тэксту

БЕЛАРУСЬ

Мы, беларусы, — народ старажытны,
У згодзе з усімі жадаем жыць.
Край наш прывольны, людзі прыгожы,
Бела-чырвоны яднае нас сцяг.
Прыпеў: Колькі не будзе лёс наш ганебны,
Кожны з нас марыць аб лепшым жыцці.
Шчасце, свабода усім нам патрэбны —
Да гэтага ўпэўнена будзем ісці.
Лёс гістарычны цяжкі нам выпаў, —
Праз усё гэта мы вякавечна прайшлі.
Мы, беларусы, — народ працавіты,
Хай наша праца прыносіць карысць.
Прыпеў.
Будзем цярпімы адзін да другога,
Ласку, пяшчоту у сэрцы трымаць.
Будзем маліцца Госпаду Богу,
Каб на планеце мір захаваць.
Прыпеў.
Мы будзем за праўду змагацца старанна,
У згодзе і дружбе з суседзямі жыць.
Ні перад кім на калені не станем,
Хай Гімн наш дзяржаўны магутна гучыць!

в.Пад'ясенка,
Бабруйшчына.

Шаноўная рэдакцыя!
У пададзеным мной тэксце Гімна допушчана памылка: замест слова «роўных» надрукавана чамусьці «родных» (№ 41 ад 12.10.94 г.).
Трэба чытаць: «І сярод роўных краін і народаў,
Жыві і квітней беларускі народ!»
З павагай
Мікалай НАСКО.

ЧЫТАЛІ?

Журналіста Алеся Карлюкевіча добра ведаюць тыя, каму неабыякавы ідэі нацыянальнага Адраджэння. Яго артыкулы літаратуразнаўчай і краязнаўчай тэматыкі апошнім часам часта з'яўляюцца на старонках беларускай перыёдыкі. А нядаўна ў серыі «Бібліятэка часопіса «Маладосць» убачыла свет першая яго кніга «Вяртанне да... Беларусі».

ВЯРТАННЕ ЗАБЫТЫХ ІМЁНАЎ

У першую чаргу згаданы зборнік нарысаў і эсэ будзе цікавы і карысны настаўнікам роднай літаратуры, мовы і гісторыі. Лепшыя старонкі кніжкі чытаюцца лёгка, на адным дыханні, ад іх проста нельга адарвацца. Менавіта такімі, напрыклад, з'яўляюцца эсэ «Кастрычніцкі пераварот не прыняла», дзе расказваецца пра лёс знакамітай і ў той жа час невядомай для нас рэвалюцыянеркі Кацярыны Брэшка-Брэшкоўскай, нарысы «Драма аднаго жыцця» (пра драматычныя акалічнасці лёсу пісьменніка і краязнаўцы Міколы Калінковіча), «Унучка славутага падарожніка» (пра жыццёвы подзвіг Соф'і Ельскай, якая паходзіць са славутага беларускага шляхецкага роду Ельскіх, які даў Беларусі і ўсяму свету не адно знакамітае імя).

Варта асобна спыніцца на эсэ «Чужыя вокны ў вокны мне глядзяць...», дзе аўтар распавядае пра варункі нялёгкай, нават трагічнай долі Міколы Іпалітавіча Канаша і Ларысы Геніюш, якія ў часы сталінскіх рэпрэсій бязвінна сталі пакутнікамі толькі за тое, што змагаліся за права любіць свой Край і звацца Беларусамі. А.Карлюкевіч падкрэслівае: узаемнае сяброўства гэты просты беларускі хлопец і геніяльная нацыянальная паэтэса пранеслі праз усё жыццё, не зважаючы на жорсткія выпрабаванні і пакуты. Да слова, Мікалай Іпалітавіч Канаш, цяперашні жыхар горада Жлобіна, і зараз, нягледзячы на свой шаноўны ўзрост, працягвае актыўна прапагандаваць родную культуру. Ён, у прыватнасці, актыўна працуе ў мясцовай арганізацыі ТБМ імя Ф.Скарыны. Таму, калі згаданае эсэ было летась надрукавана ў «ЛіМе», мы палічылі мэтазгодным перадрукаваць матэрыял у жлобінскай райгазеце «Новы дзень».

На жаль, у лімаўскай публікацыі былі допушчаны пэўныя фактычныя недакладнасці, якія засталіся і ў кнізе. Але, зрэшты, некаторыя недахопы не закрэсліваюць вельмі добрае агульнае ўражанне, што непазбежна ўзнікае пасля знаёмства з першай кнігай маладога журналіста-вайскоўца Алеся Карлюкевіча, якая вяртае з нябыту славутыя, але забытыя імёны з мінулага Бацькаўшчыны і таму паспрыяе вяртанню нацыянальнай памяці беларусаў.

Мікола ШУКАНАЎ,
супрацоўнік жлобінскай райгазеты «Новы дзень».

ТРАДЫЦЫІ І СУЧАСНАСЦЬ



Фота Белінфарма.

НАВЕЛЫ

АРЦЁМ

Аляксандр КАПУСЦІН

Было гэта, як цяпер мы кажам, у блізкім замежжы. Стаяла пералётная пара. Уздоўж узбярэжжа цёплага Чорнага мора цягнуліся вырай качак, гусей, лебедзяў. А ў маляўнічым куточку горада Сочы, дзе сярод чароўнай субтрапічнай прыроды дамавіта асталяваўся санаторый «Беларусь», раскашаваўся «вырай» беларусаў.

Адпачывала ў санаторыі і сям'я з Менска: жонка, муж і пяцігадовы Арцём. Пакуль бацькі хлапчука прымалі розныя лячэбныя працэдуры, гарэза бегаў па калідоры і раздаваў білеты. Скубане ад аркуша паперы невялікі шматок, суне сустрэчнаму ў руку і гаворыць: «У кіно», «На поезд», «На самалёт». Каля дзвярэй першы падскоквае да іх, адчыняе і кожнага прапускае наперад. Падшмаргне ўгору свае джынсавыя штонікі і зноў пабег некаму насустрач у канец калідора. Каму заіграе шчыкай усмешкай на сваім кірпаносым румяным тварыку, каму зашчабеча што... Радасна было назіраць за яго бясхітраснымі дзіцячымі забавамі.

З адзінаццаці гадзін курортнікі ішлі піць травяныя настоі. Хто страўнікавы, хто сардэчны — каму які ўрач прапісаў. Дзяцей частавалі сокамі цытрусавых. Парожнія шклянкі дарослыя ставілі на высокі стол і ветліва дзякавалі медсястры:

— Спасибо.

— Спасибо.

Арцём выпіў сваю порцыю соку, аддаў шклянку тату, каб паставіў на стол — сам не дастаў. Павярнуўся да медсястры:

— Дзякуй.

Прысутныя зарагаталі.

— У дзіцячым садку вучаць, — ні то з гонарам, ні то апраўдваючыся, растлумачыла маці.

Занялася пустагалосіца:

— Во, сапраўдны беларус! Не тое што мы.

— Настаўнікам будзе!

— Пісьменнікам!

Арцём слухаў і не слухаў. Шаркнуў далонькай па ружовых пухлаватых вуснах, зноў узняў вочы на медсястру.

— Да пабачэння. — Сказаў годна, з непадробнай шчырасцю.

І якая ж светлая і прыгожая была яго дзіцячая непасрэднасць!

— Кім ты, Арцёмка, станеш, як вырасцеш? — спытала ў яго пажылая жанчына мяккім лагодным голасам.

— Грамадзянінам Беларусі.

Хлапчук адказаў з гонарам. Але на гэты раз чыстыя, не картавыя словы яго збянтэжылі мяне. У іх ячна чулася ненатуральнасць, завучанасць.

— Маладзец, — пахваліла жанчына. Пахвала яе прагучала бадзёра, а цёплыя вочы як бы насцярожыліся. Яна пільна паглядзела з-пад апалай над лобам каштанавай прасіўленай пасмы ў ясныя, даверлівыя вачаняты хлапчука. У мяне прамільгнула здагадка, што, можа, ёй падумалася тое, што і мне: ды ці з тага мы пачынаем навучаць дзіцей патрыятызму? Дзіця ж спасцігае ісціну ў прастаце. Поўным сэрцам. Без халоднага розуму. Хіба яно не вырасце патрыётам, калі навучыцца любіць і развіваць нацыянальную культуру, народныя традыцыі?..

Хлапчук усміхнуўся жанчыне, патэпаў імпартнымі красоўкамі да дзвярэй. Я пазіраў яму ўслед і ў думках сказаў: «Дзякуй табе, Арцём, і за білеты, і за добры ўрок беларушчыны нашаму «выраю».

А ў пакой заходзілі іншыя, выпівалі сваё травяное зелле і дзякавалі медсястры:

— Спасибо.

— Спасибо.



І СМЕХ І ГРЭХ

У АЎТОБУСЕ

Зоран БОЖАВІЧ

Службовы аўтобус імчыць па прамой шырокай трасе. Ніякага лішняга шуму, акрамя ўраўнаважанага мерседэсаўскага рухавіка.

Час ад часу, праўда, трапляюцца выбоіны, тады ўсе падскокваюць і вызіраюць у вокны.

Але вось адзін з пасажыраў падае голас:

— На бліжэйшым павароце трэба ўлева браць.

— Не, — папраўляе яго другі.

— Не на бліжэйшым, а праз адзін.

— Калі хочаце трапіць, куды намерыліся, трэба адразу паварочваць управа, — даводзіць трэці пасажыр.

— Управа, ды не на гэтым, а на чарговым павароце, — удакладняе чацвёрты.

— Мы даўно ўжо павінны былі звярнуць улева, — дзеліцца сваім меркаваннем пяты пасажыр. — А так вымушаны будзем вяртацца.

— І я лічу, што свой паварот мы ўжо мінулі! — кажа шосты.

— Не згодзен толькі, што паварочваць трэба ўлева.

— Людзі, няхай шафёр глядзіць сам, — прапаноўвае сёмы пасажыр. — Ён такі ж найлепш ведае дарогу.

— Як гэта шафёр?! — не згаджаецца восьмы. — Вырашаць не шафёру. Ён павінен везці так, як мы вырашым.

— Пэўна! — падтрымліваюць гэтае меркаванне з розных бакоў. — Няхай шафёр вязе прама, пакуль мы дамовімся!

Сцямнела. Аўтобус імчыць па прамой. Знакі дарожныя паказваюць, што блізка мяжа. А пасажыры ўсё яшчэ дамаўляюцца. Толькі час ад часу, калі трапляюць на выбоіну, падскочаць, прыціхнуць нечакана, а потым зноў, яшчэ больш гучна і зацята, вядуць абмеркаванне.

Пераклаў з сербскахарвацкай мовы Іван ЧАРОТА



Д.Джарвіс: ЗАПАЛЕННЕ СЛІЗІСТАЙ ПРЫДАТАЧНАЙ ПОЛАСЦІ НОСА

Пазухі складаюць важную частку дыхальнай сістэмы, паколькі яны звязаны з насавымі шляхамі і дапамагаюць фільтраваць і саграваць паветра, якое ўдыхаецца. Пустыя ў сярэдзіне, пазухі носа таксама ўплываюць на гучанне голасу.

Маецца восем прыдатачных пазух па абодвух баках насавой поласці. На касцявой частцы знешняй сценкі поласці носа размешчаны асновы трох насавых ракавін: ніжняй, сярэдняй, верхняй.

Задняя частка поласці носа — за сярэдняй і ніжняй ракавінамі — складае насаглотачны ход. Мембраны, якія высцілаюць насавыя поласці, пакрыты тонкім пластом драбнюсенькіх валаскоў, якія знаходзяцца ў пастаянным руху і такім чынам выштурхоўваюць слізь з носа. Гэта самае эфектыўнае самаачышчальнае прыстасаванне.

Запаленне адной або некалькіх пазух звычайна развіваецца на фоне шчолачнай рэакцыі мачы. Пры жаванні мядовых сотаў (вечкаў) рэакцыя мачы змяняецца ад шчолачнай да кіслай, што азначае змяненне хімічнай рэакцыі арганізма. Таму людзям з захворваннямі насавых пазух давядзецца прыгадаць, якія прадукты выклікаюць шчолачную рэакцыю мачы, і не ўжываць іх да выздараўлення.

Рэкамендуецца жаваць мядовыя соты штогадзінна на працягу чатырохшасці гадзін. Працягласць кожнага жавання 15 мінут. Затым масу выплёўваюць. Пры вострым запаленні слізістай прыдатачнай поласці носа дастаткова правесці апісаны курс лячэння на працягу аднаго дня. Нос добра прачышчаецца, боль сціхае. На працягу яшчэ аднаго тыдня рэкамендуецца жаваць мядовыя соты раз у дзень для папярэджання магчымага рэцыдыву хваробы.

І яшчэ адна рэкамендацыя: жаваць мядовыя соты раз у дзень з восені (калі дзеці ідуць у школу) і да чэрвеня (калі школьнікаў адпускаюць на летнія канікулы), прымаючы адначасна за кожнай ядой дзве чайныя лыжачкі мёду і рэгулюючы ўжыванне ежы. Гэта гарантыя таго, што рэцыдываў гаймарыту, грыпу ці насмарку ў вас не будзе.

У выніку праведзеных доследаў доктар Джарвіс прыйшоў да вываду, што ў склад забруса (васковых вечкаў) уваходзіць нейкае моцна дзеючае рэчыва, якое бароніць дыхальны тракт ад захворванняў.

ПАРОДЫІ

Георгій Юрчанка

НЕ МНЕ!

На гары на Лысай сумна,
Ні агеньчыка ў суседзяў.
Віктар Лужкоўскі.

Згасае прозалаць сапфіра,
Ярцвет пялюшкай нікне уніз.
Мінулы дзень пудовай гіраю
На бэры стомлена завіс.

Цішэе пошапак на ўзлеску,
Скрабецца нэндза на душы.
Я запалю лучынку-трэску,
Пачну прыгадкі варушыць.

І цэлы вечар плачу цьмяна,
Жыццёвых круч пячэ імгла:
Суседка ўсю сваю крамзянасць
Камусь другому аднясла.

У РОЗДУМЕ

Не магу ў сабе разабрацца,
Як у звоне загадкавых гусляў.
Алена Руцкая.

Невыдумныя гуслі-намеры
Грэюць сэрца няўлоўным цяплом.
Расчыняе мне прывідна дзверы
Ілюзорнасці вабнай жытло.

Пачынаю ізноў хваляваца,
Адчуваючы мройны падман...
Паблукаць бы, як панна, ў палацы,
Увайсці ў белагрывы туман.

Ці пачуць мару-спеў з-за пагорка,
Што ліецца, як звонкая медзь...
Зорны б камень знайсці адвячоркам
І самую сябе зразумець...

ДАЙДУ!

Не вернеш тое, што было.
..
Не страшна згарэць за любоў.
..
Шлях да ісціны вельмі далёкі.
Іван Лашутка.

Стынь вякоў над ракой у тумане.
Мудры шэлест расквечаных ніў.
Васільковым світанкам расстанне
Я занова наўмольна сасніў.

Адплываюць, бы здані, аблокі,
Навяваючы стрыманасць дум.
Шлях да ісціны, знаю, далёкі,
Але я — будзьце пэўны! — дайду.

Вінцук АСЬЦЮК

ПРАБЛЕМЫ З ПАШТОВЫМІ СКРЫНЯМІ

Губляюцца пісьмы
У скрынях паштовых...
....
І ўсё ж давяраю
Я сіняй той скрыні...
Мікола Мельнікаў.

Губляюцца пісьмы
У скрынях паштовых
Не толькі ў старых,
Але нават і ў новых.
Пра гэта я знаю
Ад Янкі суседа.
Сто пісем згубілася
Ў гэтае лета.
Ну што за халера
Напала на скрыні?
Мо ўсё ж вінаваты
Тут колер іх сіні?
Мы скрыні з суседам
Перафарбавалі.
Ды ў скрынях чырвоных
Таксама прапалі
Суседавы пісьмы,
Паштоўкі суседкі.
Мо скралі агенты
З кітайскай разведкі?
І хоць давяраю
Я скрыні той сіняй,
Не буду я спаць,
Як ля жонкі, ля скрыні
І пісьмы мае,
А ў іх вершы, паэмы,
Не зведаюць, пэўна,
Ніякай праблемы.

Заснавальнік: ТБМ імя Ф.Скарыны.

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220029, г.Менск, вул.Чычэрына, 1

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Эрнэст Ялугін — галоўны рэдактар, Лявон Баршчэўскі, Янка Брыль, Анатоль Бутэвіч, Вінцук Вячорка, Віктар Гайсёнак, Радзім Гарэцкі, Ніл Гілевіч, Аляксей Глушко, Сяргей Запрудскі, Анатоль Клышка, Уладзімір Ламека, Змітрок Санько, Яўген Цумараў, Генадзь Цыхун, Віктар Шніп — адказны сакратар.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў адказваюць за дакладнасць фактаў і іншых звестак. Пункт гледжання аўтара можа не адпавядаць меркаванню рэдакцыі. Рукапісаў рэдакцыя не рэцэнзуе і назад не вяртае.

Індэкс 63865. Замова 44

Друкарня выдавецтва «Беларускі Дом друку». 220041, г.Менск, пр.Ф.Скарыны, 79.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
Наклад 7223 паасобнікі.
Падпісана ў друк 31.10.1994 г. у 15 гадзін.